СВЕТЛАГА ЛЁСУ, АЙЧЫНА!

WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

5 ЛІПЕНЯ 2011 г.
АЎТОРАК
№ 124
(26988)

Кошт 750 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

«МЫ ЗАНЯЛІ «СВОЙ ПАЧЭСНЫ ПАСАД МІЖ НАРОДАМІ»

Выступленне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі на парадзе войскаў Мінскага гарнізона ў азнаменаванне Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь

Фота БЕЛТА.

Таварышы салдаты, сяржанты, прапаршчыкі! Афіцэры і генералы!

Дарагія ветэраны!

Паважаныя суайчыннікі і госці!

Сёння наша Беларусь урачыста адзначае галоўнае дзяржаўнае свята — Дзень Незалежнасці!

У гэтым святе разам зліліся вялікія і святыя для ўсіх паняцці — вызваленне ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і незалежнасць беларускай дзяржавы.

Сёння мы з вялікай удзячнасцю ўспамінаем усіх, хто не схіліў галаву перад ворагам, прынёс жыццё на алтар Перамогі і абяссмерціў сваё імя.

Подзвіг гэтых герояў не памеркне ў стагоддзях!

Іх запаветы — любіць, берагчы, абараняць Радзіму — мы з гонарам і годнасцю, з гордасцю ўвасобім у жыццё!

Народ ганарыцца сваёй арміяй, наследніцай Перамогі — надзейнай апорай і духоўнай сілай краіны. Наша армія — верны абаронца стваральнай працы. Школа мужнасці для тысяч і тысяч маладых беларусаў, многія з якіх прымаюць удзел у сённяшнім парадзе.

Цяпер ваеннай пагрозы для нашай краіны няма. Але гісторыя, у тым ліку і навейшая, заклікае: порах заўсёды трэба трымаць сухім! Мірная і стваральная праца павінна быць надзейна і безумоўна забяспечана.

Нам ёсць што абараняць: родную зямлю, слаўную гісторыю, адзінства нацыі, сацыяльную справядлівасць і духоўныя каштоўнасці народа.

Мы нікому не пагражаем, ні на кога не нападаем і не збіраемся гэтага рабіць у далейшым.

Мы не распрацоўваем і не выкарыстоўваем зброю масавага паражэння. Не фінансуем міжнародную злачыннасць і тэрарызм. Не рыхтуем баевікоў для арганізацыі рэвалюцый у суседзяў. Не гандлюем жанчынамі і дзецьмі.

Памяць аб шматмільённых ахвярах сусветнай вайны павінна б прымусіць чалавецтва адмовіцца ад прымянення сілы. Знаходзіць мірныя і пазітыўныя метады вырашэння канфліктаў.

Аднак сённяшняе імкненне пэўных колаў выкарыстоўваць у палітыцы сілавыя метады, націск і эканамічныя санкцыі для прасоўвання сваіх інтарэсаў застаецца рэальнай крыніцай напружанасці.

Ідзе эскалацыя інфармацыйнай інтэрвенцыі. Без усялякага сораму ўзмацняецца маніпуляцыя грамадскай думкай. Нормай становіцца агульнае шальмаванне, у тым ліку ананімнае з дапамогай сродкаў масавай інфармацыі. Уладныя людзі прымяняюць супраць непажаданых краін зброю масавага інфармацыйнага паражэння.

Мэта ўсяго гэтага — дыктат, навязванне палітычнай волі, уніфікацыя свету на «залаты мільярд» і ўсіх астатніх — сіратлівых і ўбогіх, якія не маюць нават права голасу.

Нам узмоцнена і мэтанакіравана навязваюць бессаромныя сцэнарыі «каляровых рэвалюцый», напісаныя пад капірку ў сталіцах асобных краін. Мы разумеем, што мэта гэтых атак — пасеяць няўпэўненасць і трывогу, разбурыць грамадскую згоду. У канчатковым выніку — паставіць нас на калені і звесці да нуля ўсе заваёвы Незалежнасці.

Гэтага не будзе!

Мы выстаялі ў гады Вялікай Айчыннай, сваімі рукамі пераадолелі разруху, стварылі на сваёй цудоўнай зямлі прыгожую і гордую дзяржаву!

Мы даказалі сваё права «людзьмі звацца» і, як марылі нашы класікі-прарокі, занялі «свой пачэсны пасад між народамі».

Мы выстаім і сёння! Пераадолеем любыя цяжкасці і дастойна вытрымаем навязаныя нам выпрабаванні. Паколькі бяром сілы з невычэрпнай крыніцы традыцый нашага народа — смелага воіна і сумленнага працаўніка.

Паважаныя таварышы!

Наша шматвектарная знешняя палітыка, заснаваная на прынцыпах узаемапавагі, роўнасці і партнёрства, «новы парадак» (сумна вядомы нам тэрмін!) прадугледжвае падзел прадугледжвае як усебаковае супрацоўніцтва з нашай Расіяй, дзяржавамі былога Савецкага Саюза, так і развіццё ўзаемавыгадных адносін з іншымі саюзамі і краінамі.

Сярод нашых пастаянных прыярытэтаў — умацаванне абараназдольнасці краіны шляхам развіцця ўласных Узброеных Сіл, падтрыманне на належным узроўні боегатоўнасці рэгіянальнай групоўкі войскаў Беларусі і Расіі, паслядоўнае ўзмацненне Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы.

Кожны беларус можа быць упэўнены — сістэма нацыянальнай бяспекі заўсёды гатова надзейна абараніць канстытуцыйныя ўстоі, суверэнітэт дзяржавы, чыстае неба над нашай краінай і забяспечыць душэўны спакой людзей.

Слава беларускай арміі — нашай гордасці і надзейнаму гаранту мірнай працы!

Слава ветэранам і працаўнікам тылу Вялікай Айчыннай вайны!

Вечная слава герояў, якія аддалі свае жыцці за свабоду і шчасце будучых пакаленняў!

Будзем жа дастойны іх вялікага подзвігу! Няхай жыве і мацнее любімая Радзіма!

Са святам! З Днём Незалежнасці Рэспублікі Беларусь!

Ура!

3 ліпеня 2011 г.

Фота БЕЛТА.

У святочных мерапрыемствах 3 ліпеня прынялі ўдзел амаль 690 тыс. чалавек

У Мінску, абласных і раённых цэнтрах 3 ліпеня ў святочных мерапрыемствах, прысвечаных Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, прынялі ўдзел амаль 690 тыс. чалавек. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў МУС Беларусі.

У міліцэйскім ведамстве адзначылі, што грамадскі парадак быў забяспечаны.

Беларуская міліцыя ўжо з 30 чэрвеня, напярэдадні Дня Незалежнасці, перайшла на ўзмоцнены варыянт нясення службы. Пры гэтым у сталіцы быў задзейнічаны ўвесь мінскі гарнізон, уключаючы ўнутраныя войскі.

ISSN 1990 - 763X

Фота БЕЛТА.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ЎСКЛАЎ ВЯНОК ДА МАНУМЕНТА ПЕРАМОГІ Ў МІНСКУ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка напярэдадні Дня Незалежнасці ўсклаў вянок да манумента Перамогі ў Мінску, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.

Да падножжа манумента таксама былі ўскладзены вянкі ад урада Беларусі, іншых дзяржаўных органаў, праваслаўнай і каталіцкай канфесій, буйнейшых грамадскіх арганізацый рэспублікі, кветкі ад ветэранаў, прадстаўнікоў дыпламатычнага корпуса.

У гэтым годзе традыцыйная цырымонія ўскладання вянка кіраўніком дзяржавы да манумента Перамогі падзялілася на дзве часткі: абавязковую пратакольную і пастановча-драматычную.

Салістка Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі Настасся Масквіна выканала «Вакаліз» Сяргея Рахманінава, а ў неба ўзнялася тысяча белых паветраных шароў. Вакол плошчы стаялі дзяўчаты і юнакі ў нацыянальных касцюмах, якія трымалі ў руках запаленыя лампадкі. Акрамя таго, прылеглыя да плошчы будынкі з дапамогай праектараў ператварыліся ў вялікія экраны. Пад гукі дзяржаўнага гімна Беларусі былі зроблены тры залпы артылерыйскага салюту.

Пасля завяршэння цырымоніі Аляксандр Лукашэнка цёпла паразмаўляў з ветэранамі.

Да манумента Перамогі на цырымонію ўскладання вянкоў прыйшлі сотні жыхароў і гасцей беларускай сталіцы.

Мерапрыемства транслявалася ў прамым эфіры па беларускім тэлебачанні.

Юрый Жадобін:

«Незалежнасць — гэта магчымасць дзяржавы развівацца ў адпаведнасці з воляй народа»

Незалежнасць — гэта магчымасць дзяржавы развівацца ў адпаведнасці з воляй народа. Аб гэтым заявіў журналістам пасля параду ў Мінску міністр абароны Беларусі Юрый Жадобін.

Адказваючы на пытанне аб тым, што ён укладвае ў паняцце незалежнасці, кіраўнік ваеннага ведамства сказаў: «Гэта імкненне і магчымасці краіны будаваць і развіваць сваю дзяржаву так, як лічыць патрэбным народ, без якога-небудзь умяшання звонку. Гэта самае галоўнае».

Паводле слоў Юрыя Жадобіна, незалежнасць — гэта не толькі ваенная бяспека, але таксама эканамічная, палітычная і інш. «Мы са свайго боку лічым, што адной з асноватворных складальнікаў нацыянальнай бяспекі з'яўляецца ваенная бяспека, і мы будзем рабіць усё для таго, каб ніхто не хацеў навязваць нам сваю волю», — адзначыў ён.

Ацэньваючы сённяшні ваенны парад, міністр абароны сказаў, што вельмі задаволены тым, як працавалі яго ўдзельнікі. «Але за гэтым стаяць яшчэ і тыя людзі, якія сёння не прысутнічалі на гэтым парадзе, але якія зрабілі ўсё, што ад іх залежыць, каб ён прайшоў арганізавана, — адзначыў Юрый Жадобін. — Гэта тыя, хто рыхтаваў тэхніку, узбраенне. Яны, напэўна, прыкладалі самыя вялікія намаганні для таго, каб сёння так глядзеўся і паветраны эшалон, і механізаваная калона».

АМАЛЬ 150 ТЫС. ЧАЛАВЕК сталі гледачамі і ўдзельнікамі параду ў гонар Дня Незалежнасці ў Мінску.

У ваенным парадзе ў сталіцы прынялі ўдзел амаль 3,9 тыс. ваеннаслужачых і больш як 160 адзінак тэхнікі. Пешымі калонамі прайшлі выхаванцы Мінскага суворaўскага ваеннага вучылішча, курсанты Ваеннай акадэміі Беларусі і ваенна-тэхнічнага факультэта БНТУ, ваеннаслужачыя 120-й гвардзейскай асобнай механізаванай брыгады, 85-й і 86-й брыгад сувязі, 38-й і 103-й асобнай мабільных брыгад, а таксама транспартных войскаў. Акрамя таго, у парадных разліках прайшлі прадстаўнікі МУС, Дзяржпагранкамітэта і МНС, а таксама госці з Расіі — ваеннаслужачыя 104-га гвардзейскага дэсантна-штурмавога Чырванасцяжнага палка 76-й гвардзейскай дэсантна-штурмавой Чарнігаўскай Чырванасцяжнай дывізіі Узброеных сіл Расійскай Федэрацыі (Пскоў).

Зводная рота ганаровай варты паказала пляц-канцэрт, а затым перад мінчанамі і гасцямі сталіцы выступіў зводны аркестр Узброеных Сіл.

Калоны тэхнікі ўзначалілі танкі часоў вайны БТ-7 і Т-34, а таксама СУ-100. Былі прадстаўлены і сучасныя ўзоры ваеннай тэхнікі, сярод якіх танкі Т-72Б, «Тунгуска», «Кропка-У», «З-300ПС» і «З-300В». Таксама ў парадзе прынялі ўдзел зенітныя ракетна-гарматныя комплексы «Панцыр — С1» з Узброеных сіл Расійскай Федэрацыі. Над сталіцай праляцелі верталёты Мі-8 і Мі-24, штурмавікі Су-25, знішчальнікі Міг-29 і Су-27, самалёты L-39 (з дымамі ў колеры дзяржаўнага сцяга).

Парад прайшоў без здарэнняў, адзначылі ў сталічным міліцэйскім главуку.

БЕЛТА.

У ВАШ ГОНАР, ПЕРАМОЖЦЫ!

НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ БЕЛАРУСІ ДАЛАСЯ ВЯЛІКАЙ ЦАНОЙ

Такую думку выказаў карэспандэнту БЕЛТА старшыня Мінскай абласной ветэранскай арганізацыі Аляксандр СЛАБАДА.

У гады Вялікай Айчыннай вайны беларускі народ не здаўся нямецка-фашысцкім захопнікам, на тэрыторыі краіны быў разгорнуты шырокі партызанскі рух, і стары, і малады ўзняўся на барацьбу з акупантамі. Такога супраціўлення фашызму, як у Беларусі, не было ў ніводнай краіне свету. Пасля вызвалення адбудоўваліся гарады і вёскі, аднаўлялася народная гаспадарка.

Аляксандр Слабада падкрэсліў, што Дзень Незалежнасці — асаблівае свята для ветэранаў. Гэта падстава яшчэ раз успомніць, што зроблена за апошнія гады, як развіваецца рэспубліка. Старшыня абласной ветэранскай арганізацыі лічыць, што з тымі цяжкасцямі, якія ёсць цяпер у эканоміцы, беларускі народ дастойна справіцца, паколькі бывалі часы больш складаныя — першыя пасляваенныя гады, развал Савецкага Саюза і інш. «Мы, людзі, якія перажылі вайну, бачым, як краіна мяняецца ў лепшы бок, ператвараюцца райцэнтры, з'яўляюцца новыя прадпрыемствы», — сказаў Аляксандр Слабада.

Ён падзякаваў за тую падтрымку, якую дзяржава аказвае ветэранам, ветэранскім арганізацыям, за тое, што не забываецца подзвіг удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.

Гістарычная праўда — фундамент, на якім грунтуецца грамадская свядомасць у любой краіне

Гістарычная праўда была, ёсць і будзе фундаментам, на якім грунтуецца грамадская свядомасць у любой краіне. Такое меркаванне выказаў карэспандэнту БЕЛТА ветэран Вялікай Айчыннай вайны Віктар Цімафеевіч Калакольнікаў.

Віктар Цімафеевіч пайшоў у партызаны 18-гадовым хлопцам. Прыгранічны Бельск-Падляскі, дзе ён толькі скончыў вучобу, нечакана быў абстраляны і акупіраваны фашыстамі. У армію прызываць хлопцаў не было каму, яны самі вырашалі, як змагацца з ворагам. Віктар Калакольнікаў стаў удзельнікам падпольнай антыфашысцкай групы, а потым пайшоў у партызаны. Праз шмат гадоў пасля вайны ён даведаўся, што з кожнай сотні такіх як ён хлопцаў да вызвалення жывымі засталіся толькі тры чалавекі. У душу закралася пачуццё віны перад загінулымі і вялікае жаданне расказаць сучаснаму пакаленню праўду аб вайне, падзеі якой сёння нярэдка спрабуюць фальсіфікаваць. Ён стаў актыўным удзельнікам патрыятычнага выхавання школьнікаў і моладзі, за актыўную работу з падрастаючым пакаленнем і дзейнасць па сацыяльнай абароне ветэранаў яго імя занесена ў Кнігу славы горада Гродна.

«Кожнае пакаленне мае права пераглядаць, пераацэньваць гісторыю, але гэта не павінна быць скажэннем, каб дагадзіць палітычнай кан'юнктуры, — лічыць ветэран. — Чаго вартыя гэтыя акцыі, калі 22 чэрвеня, у дзень усенароднага смутку — дзень пачатку вайны — знайшліся тыя, хто выйшаў на плошчу свістаць, тупаць-пляскаць. Хіба гэта праяўленне памяці, павагі? Бачачы такое, раблю вывады, што мы, ветэраны, яшчэ недастаткова зрабілі для патрыятычнага выхавання гэтых маладых людзей».

Напярэдадні Дня Незалежнасці ветэран прыняў удзел у адкрыцці пад Гроднам гісторыка-культурнага комплексу «Гродзенская крэпасць. Партызанскі лагер», да ўзнікнення якога таксама прыклаў нямала сіл. 3 ліпеня ён, як і ўсе ветэраны, удзельнічаў у святочных мерапрыемствах. Дзень Незалежнасці — гэта галоўнае свята, дзень выратавання і пачатку мірнага жыцця, лічыць субяседнік. «Тая моладзь, якая чуе нас і ведае гісторыю, шануе гэты дзень і адзначае яго разам з усёй краінай», — дадаў ён.

ДЗЕНЬ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ ДЛЯ БЕЛАРУСАЎ СТАЎ СВЯТАМ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ГОНАРУ

Такое меркаванне выказаў у размове з карэспандэнтам БЕЛТА дэкан педагагічнага факультэта Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі (г. Магілёў), мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор аркестра народных інструментаў імя Л. Іванова Мікалай АЛДАНАЎ.

Ён лічыць, што гэта свята нацыянальнай гордасці, нацыянальнай культуры, гэта яшчэ адна прычына вярнуцца да сваёй гісторыі, да сваіх каранёў і ацаніць, што было, што ёсць і куды ісці далей.

Нягледзячы на капрызы надвор'я, 3 ліпеня на вуліцы Магілёва выйшла вельмі шмат людзей, у іх быў цудоўны святочны настрой, а «мы разам з аркестрам стараліся як мага яго падтрымліваць. Напрыклад, 2 ліпеня мы мелі гонар выступаць на ўрачыстасцях у вялікай канцэртнай зале Палаца Рэспублікі, а 3 ліпеня — на галоўнай канцэртнай пляцоўцы Магілёва каля мемарыяла «Вечны агонь» на Савецкай плошчы».

На думку Мікалая Алданава, Дзень Незалежнасці для беларусаў асаблівае свята, абпаленае самай бязлітаснай у гісторыі чалавецтва Вялікай Айчыннай вайной. Гэта ўрок гісторыі, які мы не павінны забываць, а гераізм і самаадданасць савецкіх воінаў служыць добрым прыкладам, як трэба любіць і абараняць сваю Айчыну.

Фота БЕЛТА.

Неба над Мінскам вечарам 3 ліпеня расквеціла 20 тон піратэхнікі

Аб гэтым паведамілі БЕЛТА арганізатары святочнага салюту ў гонар Дня Незалежнасці Беларусі.

Залпы святочнага салюту былі дадзены ў шасці месцах сталіцы ў 23.00 — каля Нацыянальнай бібліятэкі, у ваенным гарадку «Уручча», каля парку 900-годдзя Мінска, на набярэжнай Чыжоўскага вадасховішча, паблізу вуліц Шаранговіча і Матусевіча. Самае яркае відовішча было арганізавана каля стэлы «Мінск — горад-герой».

Расійская піратэхнічная кампанія паказала ў Мінску навінкі піратэхнічнай моды. На галоўным салюце каля стэлы ў адрозненне ад усіх астатніх пунктаў было выкарыстана і новае кіруючае прыстасаванне. Першыя залпы феерверку — па традыцыі ў колерах нацыянальнага сцяга.

Маляўнічыя агні асвятлялі неба над Мінскам кожныя 20 секунд. Унікальная агнявая феерыя прадоўжылася 10 хвілін.

Фота БЕЛТА.

Сустрэча з сям'ёй воіна-казахстанца, які лічыўся прапаўшым у гады вайны, прайшла ў пасольстве Беларусі ў Астане

Напярэдадні Дня Незалежнасці Беларусі ў беларускай дыпламатычнай місіі ў Астане адбылася сустрэча з сям'ёй воіна-казахстанца Кабылбека Дзюсекеева, які загінуў у гады Вялікай Айчыннай вайны і пахаваны на тэрыторыі нашай краіны. Да гэтага часу ён лічыўся прапаўшым без вестак. Аб гэтым паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў пасольстве Беларусі ў Казахстане.

На сустрэчу з беларускімі дыпламатамі прыехалі дочкі і ўнукі воіна. Кабылбек Дзюсекееў, ураджэнец Акмалінскай вобласці Казахскай ССР, удзельнічаў у ваенных дзеяннях у гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі і да гэтага часу лічыўся прапаўшым без вестак. Пры садзейнічанні Гомельскага аблвыканкама пасольству ўдалося ўстанавіць месца пахавання загінулага Кабылбека Дзюсекеева. Ён загінуў 14 кастрычніка 1943 года і быў пахаваны ў брацкай магіле ў вёсцы Шарсцін Веткаўскага раёна.

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Казахстане Валерый Брылёў перадаў дочкам воіна-казахстанца інфармацыю аб пахаванні, фатаграфію помніка воінам-вызваліцелям у вёсцы Шарсцін, а таксама юбілейны медаль «65 гадоў вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў». Дыпламат выказаў удзячнасць сям'і за неацэнны ўклад, які ўнёс іх бацька і дзед у вызваленне Беларусі.

У беларускім пасольстве сказалі аб гатоўнасці аказаць садзейнічанне ў арганізацыі наведвання роднымі месца пахавання казахстанскага воіна.

Фота БЕЛТА.

Фота БЕЛТА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА, Яўгена ПЯСЕЦКАГА і Марыны БЕГУНКОВАЙ.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ЗДЗІЎЛЕНЫ ЗАЯВАМІ РАСІЙСКАГА БОКУ АБ СУБСІДЗІРАВАННІ БЕЛАРУСІ

Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў учора на сустрэчы з дзяржаўным сакратаром Саюзнай дзяржавы Паўлам Барадзіным, перадае БЕЛТА.

«Мяне здзіўляе: няўжо расійскае кіраўніцтва не разумее, калі гаворыць, што яны нас субсідзіруюць, крэдытуюць і гэтак далей і да таго падобнае. Мы як былі зборачным цэхам саюза, так і засталіся зборачным цэхам практычна Расіі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Мы спажываем не толькі рэсурсы ад іх, ствараем тут гатовы прадукт, спажываючы каля 60 працэнтаў камплектуючых з Расіі, — сказаў Прэзідэнт. — Гэта прадпрыемствы, на якіх занята ў Расіі звыш 15 млн чалавек».

«Так яны што, не разумеюць, што падтрымліваючы эканоміку Беларусі, яны падтрымліваюць расійскія прадпрыемствы?» — задаў пытанне Аляксандр Лукашэнка.

У сваю чаргу Павел Барадзін праінфармаваў Прэзідэнта Беларусі аб ходзе рэалізацыі сумесных беларуска-расійскіх праграм і аб распрацоўцы новых сумесных праектаў.

Дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы сказаў аб тым, што распрацоўваюцца новыя саюзныя праграмы ў будаўнічым комплексе, у прыватнасці размова ідзе аб узвядзенні жылля. «Дзякуючы вам мы выйдзем на якасна новы ўзровень у саюзных праграмах», — падкрэсліў Павел Барадзін. Паводле слоў дзяржсакратара Саюзнай дзяржавы, эканоміка дзвюх краін звязана сумеснымі праграмамі ў розных сферах дзейнасці.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПРЫСВОІЎ НОВЫЯ ГЕНЕРАЛЬСКІЯ ЗВАННІ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 2 ліпеня падпісаў шэраг указаў аб прысваенні воінскіх і спецыяльных званняў, а таксама класных чыноў. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Чарговае воінскае званне генерал-маёра прысвоена палкоўнікам Васілю Гарбаценку, Сяргею Купрыку, Сяргею Бахчавану і Аляксандру Пашукевічу.

Чарговае спецыяльнае званне генерал-маёра міліцыі прысвоена палкоўнікам міліцыі Уладзіміру Сычэўскаму і Валерыю Палішчуку.

Класны чын дзяржаўнага саветніка юстыцыі 3-га класа прысвоены намесніку генеральнага пракурора — начальніку следчага ўпраўлення Генеральнай пракуратуры Андрэю Шведу і пракурору Гомельскай вобласці Валянціну Шаеву.

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка падпісаў распараджэнне, у адпаведнасці з якім за выдатныя поспехі ў вучобе і ўзорнае выкананне воінскага абавязку аб'ялена Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ваеннаслужачым Узброеных Сіл і органаў пагранічнай службы.

ДЗЯРЖАЎНЫХ УЗНАГАРОД БЕЛАРУСІ ЎДАСТОЕНЫ 54 ЧАЛАВЕКІ

За асаблівыя заслугі ў ахове дзяржаўнай граніцы і барацьбе са злачыннасцю, высокае прафесійнае майстэрства, узорнае выкананне службовых абавязкаў, заслугі ў развіцці будаўнічай галіны, камунальнай гаспадаркі, прамысловасці, транспарту, адукацыі, аховы здароўя, культуры і спорту розных дзяржаўных узнагарод удастоены 54 чалавекі. Адпаведны ўказ 2 ліпеня падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

У прыватнасці, ордэнам «За службу Радзіме» II ступені ўзнагароджаны першы намеснік старшыні Дзяржаўнага пагранічнага камітэта — начальнік галоўнага аператыўнага ўпраўлення генерал-маёр Андрэй Гарулька.

Ордэна Пашаны ўдастоены генеральны дырэктар РУП «Беларускі праэзна-артапедычны аднаўленчы цэнтр» Іван Волкаў і электразвараччык ручной зваркі будаўнічага ўпраўлення № 101 ААТ «МАПІД» Леанід Мамацюк.

Медалём «За адзнаку ў воінскай службе» ўзнагароджаны начальнік упраўлення галоўнага ўпраўлення рэжыму і арганізацыйнага забеспячэння Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Уладзімір Казлоўскі і начальнік сектара галоўнага ўпраўлення рэжыму і арганізацыйнага забеспячэння Максім Целяшчук. Гэтай узнагародай таксама адзначаны начальнік дзяржаўнай установы адукацыі «Інстытут пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь» Уладзімір Маісеенка. Сем чалавек узнагароджаны медалём «За адзнаку ў ахове дзяржаўнай граніцы». Медаля «За працоўныя заслугі» ўдастоены 34 работнікі. Сярод іх вядучы інжынер службы радыёнавігацыі і сувязі РУП «Нацыянальны аэрапорт Мінск» Вольга Аляхновіч і намеснік генеральнага дырэктара па кадрах, ідэалагічнай рабоце і сацыяльных пытаннях ААТ «Амкадор» Таццяна Міхеева.

ВІНШАВАННЕ ПРЭЗІДЭНТА

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста павіншаваў Прэзідэнта Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла Уга Чавеса Фрыаса і венесуэльскі народ са знамянальнай датай — 200-годдзем абвяшчэння незалежнасці гэтай краіны.

«У гісторыю чалавецтва залатымі літарамі назаўсёды ўпісаны імёны нацыянальных герояў Венесуэлы — знакамітых Сімона Балівара і Франсіска дэ Міранды, пад кіраўніцтвам якіх у выніку шматгадовай барацьбы была заваявана незалежнасць краіны», — гаворыцца ў віншаванні.

Прэзідэнт Беларусі падкрэсліў, што ў наш час з боку буйных дзяржаў зноў робяцца спробы каланізацыі новага тыпу — эканамічнай, палітычнай і культурнай гегемоніі. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў супрацьстаянні гэтым сучасным выклікам, нягледзячы на шматлікія перашкоды на шляху пабудовы моцнай суверэннай Венесуэлы, Уга Чавес з'яўляецца прыкладам сапраўднага самаадданага служэння сваёй Айчыне.

Прэзідэнт Беларусі пажадаў венесуэльскаму лідару поспехаў у адказнай дзяржаўнай працы і моцнага здароўя, міру і дабрабыту ўсяму дружалюбнаму венесуэльскаму народу.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

КАНФІСКАТУ Ў КРАМАХ БУДЗЕ БОЛЬШ

Супрацоўнікі Пінскага пагранатрада разам з міліцыянерамі падчас аднаго рэйду затрымалі тры машыны, якія перавозілі трыкатажнае адзенне замежнай вытворчасці без усялякіх суправаджальных дакументаў на тавар. Жыхар Пінска вёз у скрутках тавару на 60 000 000 рублёў, жыхар Мінска яшчэ больш — на 62 000 000 рублёў. А мінчанка напакавала ў машыну кантрабанды на суму 37 000 000 рублёў.

Яна СВЕТАВА.

УЗБРОЕНЫЯ СІЛЫ БЕЛАРУСІ ПРЫВЕДЗЕНЫ Ў АДПАВЕДНАСЦЬ З АКТУАЛЬНЫМІ ВЫКЛІКАМІ І ПАГРОЗАМІ

Узброеныя Сілы Беларусі прыведзены ў адпаведнасць з актуальнымі выклікамі і пагрозамі сучаснасці. Аб гэтым учора заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на прыёме выпускнікоў факультэта Генеральнага штаба Узброеных Сіл, камандна-штабнога факультэта Ваеннай акадэміі Беларусі і ваенных навучальных устаноў Расіі, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

«Мы памятаем, што наш дабрабыт, як і дабрабыт усіх народаў Еўропы, аплачаны цяжкай ратнай працай і неўміручым подзвігам салдат і афіцэраў Савецкай арміі. Дзякуючы адданасці і мужнасці ўсіх брацкіх народаў СССР ужо сёмае дзесяцігоддзе на беларускай зямлі захоўваецца мір», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Паводле яго слоў, сучасная армія прад'яўляе да афіцэрскага корпуса самыя сур'ёзныя патрабаванні як у прафесійным, так і ў маральна-этычным плане.

«Апошнія гады Узброеныя Сілы Беларусі былі істотна мадэрнізаваны. Яны прыведзены ў адпаведнасць з актуальнымі выклікамі і пагрозамі нашага часу. Прыкметна павысілася якасць падрыхтоўкі кіруючага складу і войскаў у цэлым. Робіцца ўсё магчымае для падтрымання тэхнікі і ўзбраення ў стане боегатоўнасці», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Ён падкрэсліў, што асаблівая ўвага ўдзяляецца выхаваўчай і ідэалагічнай рабоце. Так, у Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Беларусі значнае месца адводзіцца павышэнню матывацыі ваеннай службы і ўмацаванню кадравага патэнцыялу Узброеных Сіл і іншых воінскіх фарміраванняў. «Вы і ёсць гэты новы кадравы патэнцыял! Вас чакаюць складаныя і адказныя задачы. Менавіта вам трэба будзе падтрымліваць і ўмацоўваць баявую гатоўнасць, займацца ваенна-навуковай і ваенна-педагагічнай дзейнасцю, навучаць і выхоўваць сваіх падначаленых і, вядома, павышаць прэстыж армейскай службы. Памятайце, высокі маральны дух і любоў да Айчыны заўсёды былі асновай забеспячэння ваеннай бяспекі дзяржавы», — сказаў Прэзідэнт, звяртаючыся да афіцэраў-выпускнікоў.

Пры гэтым ён асабліва адзначыў, што прызнанне і поспех прыйдуць да тых, хто зможа спалучыць веды, атрыманыя ў ВНУ, з поўнай самаддачай, арганізаванасцю і дысцыплінай. «Кіраўніцтва дзяржавы і грамадзяне краіны вераць у вас, разлічваюць на ваш высокі прафесіяналізм і адказнасць», — падкрэсліў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы таксама асобна звярнуўся да афіцэраў-выпускнікоў Узброеных Сіл Казахстана. «Нашы краіны звязваюць даўняя дружба і супрацоўніцтва. Са стварэннем Мытнага саюза Беларусі, Расіі і Казахстана наша партнёрства яшчэ больш умацуецца, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Вы заўсёды будзеце жаданымі гасцямі Беларусі, паколькі дружба з брацкім казахскім народам цяпер набывае яшчэ большую значнасць, як у развіцці эканомікі, так і ў забеспячэнні бяспекі нашых дзяржаў».

Аляксандр Лукашэнка таксама ўручыў спецыяльныя лісты аб аб'яўленні Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь шэрагу ваеннаслужачых Узброеных Сіл і органаў пагранічнай службы за выдатныя поспехі ў вучобе і ўзорнае выкананне воінскага доўгу. Спецыяльны ліст аб аб'яўленні падзякі таксама ўручаны ваеннаслужачаму Узброеных Сіл Казахстана выпускніку факультэта Генеральнага штаба Узброеных Сіл Ваеннай акадэміі Беларусі Фазылале Бадэнаву.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

УГА ЧАВЕС ВЯРНУЎСЯ НА РАДЗІМУ

Прэзідэнт Венесуэлы Уга Чавес, які праходзіў на Кубе курс рэабілітацыі пасля выдаленняракавай пухліны, вярнуўся ў Каракас, паведамляе мясцовы тэлеканал Venezolana de Television.

У аэрапорце прэзідэнта Венесуэлы сустракала дэлегацыя на чале з яго намеснікам Эліям Хауа. Па словах Чавеса, якія прыводзіць агенцтва Associated Press, ён адчувае сябе добра. Пра тое, што Чавес з'ехаў лячыцца на Кубу, стала вядома на пачатку чэрвеня. Паведамлялася, што 10 чэрвеня яму правялі аперацыю па выдаленні абсцэсу ў тазавай вобласці. Пасля гэтага Чавес доўгі час не з'яўляўся на публіцы, з-за чаго ў прэсе сталі хадзіць чуткі пра выяўленне ў яго цяжэйшага захворвання, аж да раку.

ЦІМАШЭНКА НААДРЭЗ АДМАЎЛЯЕЦЦА ЎСТАВАЦЬ У СУДЗЕ

4 ліпеня ў Пячэрскім райсудзе Кіева працягнуўся разгляд па «газавай справе» супраць экс-прэм'ера Украіны, лідара партыі «Бацькаўшчына» Юліі Цімашэнка, якая тычыцца падпісання ёю газавых кантрактаў з Расіяй у 2009 годзе, у бытнасць кіраўніком урада. Цімашэнка абвясціла, што мае намер прыцягнуць для абароны ў «газавай справе» новага адваката.

Паводле слоў экс-прэм'ера, яе абаронца Сяргей Уласенка знаходзіцца «ў камандзіроўцы», а другому яе адвакату, Мікалаю Цітарэнку, спатрэбіцца месяц на азнаямленне са справай. Суддзя задаволіў хадайніцтва часткова — разгляд справы перанеслі на раніцу 6 ліпеня. Цімашэнка назвала гэта абмежаваннем яе права на абарону. Акрамя таго, перад пасяджэннем суда Цімашэнка заявіла, што за ёй вядзецца сачэнне, а яе паплечнікаў праслухоўваюць, паведамляе NEWSru.ua. Тым часам мясцовыя СМІ пішуць, што Юлія Цімашэнка дэманстратыўна адмаўляецца ўставаць, выказваючыся ў судзе, а таксама ўвесь час уступае ў спрэчкі з суддзёй.

АРЫШТАВАНЫ КІРАЎНІКІ ВЯДУЧЫХ ФУТБОЛЬНЫХ КЛУБАЎ ТУРЦЫІ

Паліцыя Турцыі арыштавала ў нядзелю 40 кіраўнікоў і адміністратараў вядучых футбольных клубаў краіны, а таксама футбалістаў у рамках расследавання справы аб арганізацыі дагаворных матчаў, паведамляюць інфармагенцтвы.

Не выключана, што лік затрыманых хуткім часам можа ўзрасці. Нядзельныя арышты — другая буйная аперацыя турэцкай паліцыі па супрацьдзеянні карупцыі ў футболе. У сакавіку-красавіку 2010 года ў Стамбуле былі ўзяты пад варту 55 чалавек, у тым ліку вядомыя ў Турцыі трэнеры і футбалісты.

ШКОДА АД ЛІЎНЕВЫХ ДАЖДЖОЎ У МАЛДОВЕ ПЕРАВЫСІЛА $1,7 МЛН

Урон, нанесены сельскай гаспадарцы Малдовы дажджамі з градам, якія прайшлі ў канцы чэрвеня, паводле папярэдніх ацэнак, перавысіў 20 млн леяў ($1,7 млн).

Паводле звестак Службы грамадзянскай абароны і надзвычайных сітуацый Міністэрства ўнутраных спраў, з-за ліўневых дажджоў і граду па краіне пацярпела 5,1 тыс. га пасеваў, 272 га вінаграднікаў і 140 га садоў.

СОТНІ КІЛАГРАМАЎ КАШТОЎНАСЦЯЎ ЗНОЙДЗЕНЫ Ў СТАРАЖЫТНЫМ ІНДЫЙСКІМ ХРАМЕ

У старажытным храме Падманабхасвамі на поўдні Індыі знойдзены скарбы, паведамляюць інфармагенцтвы. Сотні кілаграмаў залатых і сярэбраных манет, дыяментаў і жэмчугу знойдзены ў скарбніцы, якая была апячатана ў XIX стагоддзі.

Спецыялісты мяркуюць, што гэтыя каштоўнасці — дары вернікаў богу Вішну, накапашаныя за некалькі стагоддзяў. Найвялікшую цікавасць навукоўцаў выклікалі манеты з усяго свету, у тым ліку брытанскай Ост-Індскай кампаніі, Венецыі, Аўстраліі, суседняга княства Майсур. Пасля гэтых знаходак храм Падманабхасвамі па ступені багацця можа параўнацца са славутым храмам Венкатэшвара ў штаце Андхра-Прадзеш.

Два стабальныя вынікі на ЦТ па фізіцы і пяць — па хіміі

Абітурыент 2011

Як толькі сталі вядомыя вынікі ўдзельнікаў ЦТ па матэматыцы, наведнікі інтэрнэт-партала TUT.BY тут жа кінуліся іх актыўна абмяркоўваць і тлумачыць на свой лад:

«Сярэдні бал 21 азначае, што ў сярэднім усе атрымалі «двойкі» і прадметам не валодаюць. Ганьба ўсёй сістэме адукацыі. Добра, хоць не ідыёты!»;

«Лепшая сістэма адукацыі ў дзеянні!»;

«Тупеем, таварышы».

«А калі б ўсе здалі на 70-80 балаў, гэта было б здорава? Камусьці ўсе роўна прыйшлося б ісці ў ПТВ ці адразу рознарабочым, месцаў у ВНУ ўсё роўна на ўсіх не хопіць. Ведаеце, як было б крыўдна ісці ў ПТВ з 80 баламі па ўсіх прадметах?! А так паспрабаваў будучы пралетарый свае сілы, атрымаў 5—15 балаў, сам сабе пацвердзіў тое, што і раней ведаў, а затым бадзёра пакрочыў у напрамку бліжэйшай будоўлі (яшчэ паболей там заробіць, чым разумнікі)»;

«Сама сёлета тэсціравалася па матэматыцы, адразу скажу, што не рыхтавалася зусім. Маленькае дзіця, таму часу асабліва не было. Рашыла 6 самых простых заданняў (дзеянні з дробамі пераважна і так, што засталося ў галаве пасля школы), і адзін правільны адказ проста ўгадала. Вынік 16 балаў!!! Так што тыя, хто набраў па нулю, відаць па ўсім, увогуле ўяўлення не маюць пра матэматыку, нават мізэрнага. Як яны школу ўвогуле закончылі?»

Нагадаем, што па матэматыцы сёлета 33 удзельнікі ЦТ атрымалі 100 балаў са 100 магчымых, а 490 чалавек не здолелі набраць увогуле ніводнага бала.

— Хачу падкрэсліць, што атрыманыя вынікі ЦТ (у балах ці працэнтных паказчыках) ні ў якім разе не характарызуюць узровень падрыхтоўкі абітурыентаў па канкрэтнай вучэбнай дысцыпліне. Для гэтага існуюць выпускныя іспыты ў школе, — паведаміў у гутарцы з журналістам «Звязды» **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ.** — Галоўным на ЦТ з'яўляецца не канкрэтны тэставы бал, а перавага абітурыента ў параўнанні з іншымі прэтэндэнтамі на студэнцкі білет. Балы на ЦТ не могуць і не павінны дубляваць школьную адзнаку. Балы — гэта рэйтынгавае месца канкрэтнага чалавека ў агульнай плыні абітурыентаў. А цэнтралізаванае тэсціраванне — інструмент для дыферэнцыяцыі абітурыентаў па ўзроўні і якасці іх падрыхтоўкі. Стабальнікаў шмат быць не павінна, таму што ў прыёмных камісій у гэтым разе абавязкова ўзнікнуць сур'ёзныя праблемы з іх залічэннем (дыферэнцыяваць абсалютныя вынікі проста немагчыма), але, з іншага боку, наяўнасць стабальных вынікаў пацвярджае, што нерашальных заданняў на ЦТ няма і з усімі заданнямі можна справіцца.

Абсалютныя вынікі на ЦТ па матэматыцы атрымала ў гэтым годзе ўсяго 0,03 працэнта ад агульнай колькасці (33 чалавекі), па грамадазнаўстве — 0,05 працэнта (6 чалавек). Немалаважна і тое, што «геаграфія» стабальных вынікаў ахоплівае ўсю краіну і атрымаць 100 балаў можа не толькі выхаванец прэстыжнай сталічнай установы, але і выпускнік звычайнай вясковай школы.

А днямі сталі вядомыя вынікі цэнтралізаванага тэсціравання яшчэ па чатырох дысцыплінах. На ЦТ па хіміі стабальныя сертыфікаты атрымаюць сёлета 5 чалавек. І 3 абітурыенты набралі па гэтым прадмеце нуль балаў. На ЦТ па фізіцы — 2 стабальныя вынікі і 79 нулявых. На ЦТ па біялогіі — адзін стабальны вынік і 11 нулявых. На ЦТ па сусветнай гісторыі лепшы вынік — 97 тэставых балаў, затое нулявых вынікаў няма, а самы нізкі вынік — 4 балы (адзін чалавек). Трэба заўважыць, што на цэнтралізаваным тэсціраванні па такіх дысцыплінах, як гісторыя, геаграфія, грамадазнаўства традыцыйна не назіраецца такіх правальных вынікаў, як на ЦТ па дакладных дысцыплінах. І сярэдні бал там вышэйшы, і нулявыя балы — вялікая рэдкасць...

Надзея НІКАЛАЕВА.

КАЗКІ СТАРОГА «БЕЛАРУСЬФІЛЬМА», альбо Калі нашы аніматары зробяць беларускага «Шрэка»?

Шануй сваё!

(беларуская анімацыя вачыма яе стваральнікаў)

ДНЯМІ я патрапіла на незвычайнае мерапрыемства. Журналістам паказвалі новыя беларускія мультфільмы. Зладзілі такі адмысловы паказ, каб хоць прэса пабачыла анімацыю вытворчасці студыі мультыплікацыйных фільмаў «Беларусьфільма»... Бо сапраўды беларускія мульцікі нельга пабачыць амаль нідзе: ні па тэлебачанні, ні ў кінатэатрах... Можна, праўда, прыдбаць дыск «Зборнік мультфільмаў», які год таму выпусціла кампанія «ВІГМА» па заказе «Беларусьфільма». Але знайсці яго сярод мноства дыскаў з заморскай анімацыяй можа толькі той, хто ведае пра яго існаванне. Рэкламы няма.

Ад чаго перасмыкае беларускіх аніматараў?

І вось мы паглядзелі «Беларускія прымаўкі» (2008) Міхаіла Тумелі, «Птаху» (2009) Аляксандра Ленкіна, «Было лета» (2010) Ірыны Кадзюковай, «Аднойчы, пад Новы год» (2009) Алены Пяткевіч, чацвёрты выпуск «Аповесці мінулых гадоў» пра гербы беларускіх гарадоў і мястэчак, «Лісу і жураўля» (2010) Уладзіміра Пяткевіча, «Сараканожку» (2011) — мультфільм для самых маленькіх Таццяны Кубліцкай і сумесны беларуска-расійскі мультфільм «Казкі старога піяніна. Сяргей Пракоф'еў» (2011). Беларуская анімацыя — гэта самабытны свет, абсалютна ўнікальны, хоць у нечым і не зусім дасканалы. З-за сваёй адарванасці ад тэхнічнага прагрэсу, адсутнасці новых тэхналогій і іншых 3D-магчымасцяў сучаснасці беларуская анімацыя не страціла яшчэ душэўнасці і шчырасці. Але і здаровыя капіталістычныя стасункі ў кінастудыі «Беларусьфільм» са спажыўцамі пакуль так і не склаліся.

Кадр з мультфільма Аляксандра Ленкіна «Птаха» (2009).

Калі беларускія аніматары чуюць пытанне пра распаўсюджванне сваіх фільмаў, іх пачынае нервова перасмыкаць... І я іх разумею. Па сутнасці, усё, што яны могуць (а гэта ўжо, безумоўна, нямала!) — гэта зрабіць мультфільм. Далей — дыстрыб'юцыя, паказы па ТБ, выпуск дыскаў, удзел у кінафестывалях — усё справа «Беларусьфільма». Мультыплікатары не маюць нават ніякіх аўтарскіх маёмасных правоў на свае карціны. Усе гэтыя правы належаць кінастудыі. Таму нават самі адправіць свой фільм на фестываль рэжысёры не могуць.

— Зараз прадзюсарам у нас намінальна нібыта выступае Міністэрства культуры, — распавядае **рэжысёр-мультыплікатар Уладзімір ПЯТКЕВІЧ**. — Але там няма ніякіх службаў, якія б займаліся прасоўваннем і пракатам. На студыі створаны рэкламны аддзел, напрыклад... Але гэта такія занядбаныя канторкі, якія, дай Бог, калі хоць на нейкі фестываль адправяць. І ўсё — на гэтым іх дзейнасць заканчваецца. Гэта несур'ёзна. А вось неяк я рабіў невялічкі фільм для французаў. Там зусім іншая сістэма, чым у нас. Там таксама ёсць прадзюсар. Але працуе ён абсалютна па-іншаму. Ён падае маю заяву ва ўстанову — іх аналаг Міністэрства культуры. Гэтая ўстанова дае прадзюсару паперку, што, маўляў, праект зацверджаны, прыняты да вытворчасці, і прадзюсар з гэтай паперкай абыходзіць і абзвоньвае ўсе тэлеканалы, дзе ў яго ёсць знаёмыя і дзе гэты праект нейкім чынам на профілі. Фільм не запускаецца ў вытворчасць, пакуль прадзюсар не набярэ неабходны пакет заказаў. Яму не столькі важна атрымаць нейкія грошы ад тэлеканалаў, колькі атрымаць згоду на далейшы пракат гэтага праекта на тэлебачанні, калі ён будзе гатовы. І калі ў прадзюсара ёсць пакет заказаў ад каналаў, якія ў будучыні забяспечаць пракат карціны, ён дае каманду рэжысёру пачынаць працу над кіно. А ў нас атрымліваецца так: мы робім кіно, і невядома, куды мы яго потым уцюхаем.

Цікава, тым не менш, што айчынная студыя мультыплікацыйных фільмаў развіваецца. І нават павялічыла аб'ём вытворчасці. Калі ў 2009 годзе агульная працягласць мультфільмаў складала 44 хвіліны, у 2010 — 66 хвілін, то ў 2011 годзе мяркуецца зрабіць 81 хвіліну (7 мультфільмаў). Праўда, першапачаткова сёлета планавалася мультфільмаў на 90 хвілін, але з-за раптоўнай эканамічнай нестабільнасці ў краіне планы давялося падкарэктаваць.

— Мы пашырылі вытворчасць. Пару гадоў таму мы здымалі 3-4 мультфільмы ў год. Сёлета здымаем больш. Прагрэс відавочны, — перакананы **рэжысёр-аніматар Аляксандр ЛЁНКІН**, — Таму нам патрэбны маладыя спецыялісты, творчыя і тэхнічныя супрацоўнікі. Каб дапамагаць нам рабіць дастойнае кіно.

Шрэк за гарамі

Што ж тычыцца ўкаранення новых тэхналогій і стварэння поўнаметражных калектыўных 3D-мультфільмаў, якіх усе так чакаюць ад нашых аніматараў, то да гэтага яшчэ вельмі далёка... Беларускія аніматары ў адзін голас сцвярджаюць, што для гэтага патрэбна сур'ёзнае абсталяванне, сур'ёзныя грошы, шмат сур'ёзных камп'ютарных спецыялістаў...



Кадры з мультфільма Міхаіла Тумелі «Беларускія прымаўкі» (2008).

— Час ад часу ўзнікаюць ідэі зрабіць сумесны поўнаметражны мультфільм. Таксама як і лунаюць у паветры ідэі зрабіць фільм, які можна будзе паказваць у 3D-кінатэатрах, — распавядае Аляксандр Ленкін. — Але гэтыя ідэі, як правіла, упіраюцца ў начальства. А начальства ў нас шмат. У нас ёсць дырэктар мультсудыі, дырэктар кінастудыі, старшыня Дэпартамента па кінематаграфіі. І ўся гэтая структура даволі грувасткая, непаваротлівая. Для таго, каб нейкая ідэя была рэалізаваная, на мой погляд, самым галоўным з'яўляецца жаданне нейкай асобы з гэтага начальства і яе рашучасць у дзеяннях. Я абсалютна ўпэўнены, калі б каму-небудзь з іх прыйшла ў галаву светлая ідэя зняць 3D-фільм, то нягледзячы ні на што, мы б яго знялі. Тым больш што ніхто не прымушае нас рабіць адразу поўнаметражны 3D-фільм...

Атрымліваецца, што рэжысёры проста закладнікі сітуацыі. Нармальных умоў для працы на кінастудыі ў іх няма, сыходзіць таксама няма куды... Хіба што з'язджаць. Рэжысёры сталага пакалення гэты шлях не выбіраюць, але яго выбіраюць маладыя творцы. Вось чаму айчыннай кіна- і анімацыйнай вытворчасці так складана знайсці маладых аўтараў.

— Мы ўсе ўжо стомленыя ад пытання, калі мы зробім беларускага «Шрэка», — скардзіцца **рэжысёр-мультыплікатар Таццяна КУБЛІЦКАЯ.** — Насамрэч гэта будзе не хутка. Мы, у прынцыпе, робім тое, што можам у гэтых умовах... А ад нас чакаюць нейкі поўнаметражны 3D-шны мультфільм. Насамрэч мы проста да гэтага не гатовы. Каб зрабіць поўнаметражны 3D-мультфільм, трэба, у любым выпадку, акрамя творчай групы, сцэнарый добры, рэжысёр, які гэтым зоймецца. У нас няма вялікай колькасці людзей з якаснай тэхнічнай падрыхтоўкай і мастацкай адукацыяй, якія б сёння маглі ўзяцца рабіць такі фільм. Плюс сама падрыхтоўка да такога фільма патрабуе не аднаго года. А мы сабе гэтага дазволіць не можам, таму што бюджэт кінастудыі плануецца толькі на год наперад. А пачынаць працаваць над шматгадовым праектам, не будучы ўпэўненымі ў тым, што з ім будзе далей, мы не хочам...

Зрэшты, за ўсё гэта было б не так крыўдна, калі б мы ўмела распараджаліся тым, што ў нас ёсць, — выдатнымі мультфільмамі.

Само сабой не знікае пытанне: чаму так складана патэлефанаваць на сваё ж роднае беларускае тэлебачанне і прапанаваць новы класны беларускі мультфільм?!

— Не, не складана, сцвярджае **Сяргей СЫЧОЎ, дырэктар студыі мультыплікацыйных фільмаў «Беларусьфільма».** — Але здараецца рознае: то асабістыя стасункі паміж дырэктарам студыі і кіраўнікамі тэлебачання сапсаваліся, то яшчэ нешта... Ну, і наогул, яны ж гэта паказваюць амаль бясплатна. Ці плацяць тры капейкі за паказ..., — распавядае Сяргей Рыгоравіч.

Усё-ткі, напэўна, гэта няправільна, калі вырашальным з'яўляецца не прафесіяналізм і адладжаная надзейная сістэма стасункаў паміж вытворцамі фільмаў, дыстрыб'ютарамі і спажыўцамі, а чалавечы фактар, нейкае асабістае непрыняцце. І пакуль гэтая сітуацыя не зменіцца, беларускія мультфільмы так і будуць пыліцца на паліцах кінастудыі, а рэжысёры зрэдку на нейкіх самадзейных пачатках будуць паказваць сваё анімацыйнае кіно гледачам. Тут складана абвясціць вінаватым кагосьці аднаго. Вінаватыя ўсе: і рэжысёры, і кінастудыя з-за сваёй рэкламнай пасіўнасці, абсалютна непрымальнай ў капіталістычным глабалісцкім грамадстве. Магчыма, нават журналісты, якія недастаткова ўвагі надаюць айчыннай анімацыі, яе праблемам і дасягненням. Вось распавядалі мне пра адзін выпадак, калі ў кінатэатры «Ракета» зладзілі цэлую праграму беларускай анімацыі. І нават тэлебачанне прыехала зняць пра гэтую падзею сюжэт. Але потым чамусьці гэты сюжэт не трапіў у эфір. Відаць, там вырашылі, што паказ беларускай анімацыі — не такая значная падзея. А шкада...

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

«Прамая лінія»

ЯК ЗБЕРАГЧЫ СЛЫХ?

Па звестках медыцынскай статыстыкі, у 6% насельніцтва ёсць розныя ступені парушэння слыху. Якія прычыны могуць прывесці да гэтага? Як захаваць нармальны слых як мага даўжэй? І ўвогуле, якія хваробы пагражаюць нашым вушам і якія сучасныя метады іх лячэння існуюць зараз? Аб гэтым мы пагаворым падчас чарговай «прамой лініі». Удзел у ёй возьме загадчыца **ЛОР-аддзялення для дарослых кансультацыйнай паліклінікі РНПЦ отарыналарынгалогіі Ніна Юр'еўна КАСЦЮК.**

«Прамая лінія» сёння, **з 12.00 да 13.00** па нумарах **8(017) 292 38 92 і 292 38 21.**

БЕЛАРУСКА НАДЗЕЯ АСТАПЧУК ПАКАЗАЛА ЛЕПШЫ СУСВЕТНЫ ВЫНІК СЕЗОНА Ў ШТУРХАННІ ЯДРА

Беларускія лёгкаатлеты сталі прызёрамі міжнародных турніраў у Расіі і Францыі, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.

Надзея Астапчук на мемарыяле братоў Знаменскіх у расійскім Жукоўскім выйграла спаборніцтвы па штурханні ядра, паказаўшы лепшы вынік сезона ў свеце — 20 м 94 см. Беларуска Алена Копец была пятая — 17 м 64 см. У спаборніцтвах па скачках у даўжыню Настасся Мірончык-Іванова заняла трэцяе месца з вынікам 6 м 75 см.

У французскім Сатвілі ў актыве беларусаў чатыры ўзнагароды. Павел Крывіцкі стаў лепшым сярод кідальнікаў молата — 77 м 2 см, а Юрый Шаюноў паказаў другі вынік — 75 м 71 см. Два медалі заваявалі бягухі на 800 м — Марына Арзамасава фінішавала другой — 2 мін. 1,47 сек., а Святлана Усовіч заняла трэцяе месца — 2 мін. 1,79 сек.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ВЕЦЕР ПА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ ГУЛЯЕ

Купал Свята-Уведзенскай царквы ў вёсцы Дуброўка Добрушскага раёна пацярпеў ад моцнага ветру, які прайшоў па Гомельшчыне. Там жа пашкоджаны дахі прытулку манастыра, кацельні, мясцовых ФАПа і сталовай. У КСУП «Велікаборскі» Хойніцкага раёна вецер разбурыў тры сіласныя вежы, якія не эксплуатаваліся. Шыфер зляцеў з дахаў 13 жылых дамоў, Дома культуры, малочнатаварных фермаў, іншых сельскагаспадарчых пабудоў у Калінкавіцкім і Хойніцкім раёнах. Маштабы наступстваў стыхіі ўдакладняюцца.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ВАДЗІЦЕЛЬ ЗБІЎ ПЕШАХОДА НА ПАРТЫЗАНСКІМ ПРАСПЕКЦЕ Ў МІНСКУ І ЗНІК З МЕСЦА ЗДАРЭННЯ

Учора каля 3.40 на Партызанскім праспекце ў Мінску неўстаноўлены вадзіцель, кіруючы неўстаноўленым афтамабілем, збіў пешахода і знік з месца здарэння. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ва УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама.

Мужчына перасякаў праспект па нерэгулюемым пешаходным пераходзе, справа налева па ходу руху аўтамабіля. У выніку ДТЗ пешаход атрымаў закрытую чэрапна-мазгавую траўму лёгкай ступені цяжкасці, пералом некалькіх рэбраў, закрытую траўму грудной клеткі і быў шпіталізаваны ў аддзяленне рэанімацыі.

ДАІ просіць сведак гэтага здарэння пазваніць па тэл.: (8017) 222 08 40, 222 25 05, 222 08 31, 222 17 17 або 102.

ЧАГО ЧАС МАРНАВАЦЬ?

Страхавы агент, які працаваў побач з прапускным пунктам Селішча, што ў Добрушскім раёне, вырашыў паралельна заняцца яшчэ адным відам дзейнасці. 23-гадовы малады чалавек без спецыяльнага дазволу ажыццяўляў абмен замежнай валюты. Пры затрыманні ў яго канфіскаваны долары, еўра і расійскія рублі, паведамілі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама.

НА ДЗЕНЬ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ — ПАДАРУНАК РОДНАМУ ГОРАДУ

Беларускі мастак дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, кераміст, скульптар, жывапісец, сябра Саюза беларускіх мастакоў Мікалай Несцярэўскі з Мінска на Дзень Незалежнасці адкрыў у Дзятлаўскім раённым Доме культуры сваю персанальную выставу і ўсе яе экспанаты падараваў роднаму гораду.

Сотні жыхароў Дзятлава прыйшлі 3 ліпеня ў мясцовы РДК, дзе на двух паверхах адкрылася прыватная выстава Мікалая Несцярэўскага. Кіраўніцтва Дзятлаўскага райвыканкама, сябры, знаёмыя і простыя гараджане шчыра віталі свайго знакамітага і шчодрага земляка. І хоць нарадзіўся Мікалай Лаўрэнцьевіч на Беласточчыне ў вёсцы Бацюты, пасля вайны сям'я іх пераехала на Дзятлаўшчыну. «У 1945 годзе палякаў перасялялі ў Польшчу, а беларусаў — на ўсход. Мы вельмі не хацелі пакідаць Бацюты. Бо ў нас было 18 гектараў зямлі, 5 кароў, некалькі коней, шмат свіней, авечак, сотні курэй. Мы жылі даволі добра. Праўда, шмат працавалі, але і шмат мелі. Жылі заможна ажно да восені 1939 года. А потым жыць стала цяжка. І мы пад прымусам пераехалі да сваякоў у Дзятлава на Гарадзеншчыну», — прыгадаў на адкрыцці выставы Мікалай Несцярэўскі, якому ў сакавіку сёлета споўнілася 80 гадоў з дня нараджэння.

На дзятлаўскай зямлі і прайшлі юнацкія гады мастака. Тут ён пачаў свой працоўны шлях, адсюль пайшоў, як кажуць, у «вялікі свет». Прырода шчодра надзяліла талентамі Мікалая Несцярэўскага. Спачатку ён працаваў у арцелі па вырабе мэблі, сталяром. Там авалодаў майстэрствам апрацоўкі дрэва. А калі працаваў у Дзятлаўскім раённым Доме культуры інструктарам — арганізаваў духавы аркестр. Мікалай Лаўрэнцьевіч любіць і ўмее спяваць. Дарэчы, падчас адкрыцця выставы сваім землякам ён цудоўна выканаў раманс Максіма Багдановіча «Зорка Венера».

Але сэнс свайго жыцця Мікалай Несцярэўскі знайшоў у галіне мастацкай керамікі. Праца з глінай, яе пластыка, апрацоўка заўсёды вабілі юнака. Ён паехаў працаваць на фабрыку мастацкай керамікі, што ў Івянцы, пераймаў вопыт вядомых майстроў.

У 1969 годзе скончыў Мінскі тэатральна-мастацкі інстытут (цяпер Акадэмія мастацтваў) і да самай пенсіі працаваў на Мінскім мастацка-вытворчым камбінаце. Працаваў плённа. Пазнаў такія сакрэты апрацоўкі керамікі, якія і цяпер не могуць паўтарыць сучасныя беларускія майстры.

Творы мастака сёння ўпрыгожваюць фасады і інтэр'еры многіх будынкаў і ўстаноў не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Ён адзін з аўтараў афармлення станцыі метро «Плошча Якуба Коласа», кавярні «Бульбяная» ў Мінску, будынкаў аэрапорта «Мінск-2». Сцены Гродзенскага тэатра лялек упрыгожваюць таксама яго творы. Мікалай Лаўрэнцьевіч займаўся афармленнем магазіна «Мінск» у Валгаградзе, яго працы сёння можна таксама ўбачыць у аздараўленчым цэнтры «Баравічок» на Дзятлаўшчыне, у Дзятлаўскай гімназіі № 1, у фондах Беларускага саюза мастакоў, Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, Раўбіцкім музеі народнага мастацтва, Гродзенскім гістарычным музеі, Дзятлаўскім краязнаўчым музеі, у музеях за межамі Беларусі і ў іншых месцах. Мікалай Несцярэўскі выканаў узоры капітэлі, пілястры, кранштэйна, разетак карнізаў і іншых упрыгожванняў для Рэзідэнцыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Сваім землякам беларускі мастак падараваў партрэты-барэльефы ў кераміцы каралёў і князёў Вялікага Княства Літоўскага, беларускіх пісьменнікаў, мастакоў, палітыкаў, вучоных. У дар Дзятлаву мастак пакінуў керамічныя і дэкаратыўныя скульптуры, розныя вырабы, посуд, карціны жывапісу, абразы. «Вельмі прыемна, што шэраг маіх работ застаецца ў Дзятлаве — горадзе майго юнацтва. Няхай дакрананне да прыгожага сцвярджае ўсё лепшае, самае добрае ў людзях, дорыць ім радасць», — сказаў Мікалай Несцярэўскі ў час перадачы сваіх твораў Дзятлаву і дзятлаўчанам.

Сяргей ЧЫГРЫН. Фота аўтара.

СТАРАЖЫТНЫ Віцебск традыцыйна ў апошнія дні перад пачаткам чарговага міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» нейкім чынам нагадвае жаніха, які перад урачыстасцю «прыхарошваецца».

Ужо прыязджаюць «свякі» — удзельнікі і госці з іншых гарадоў і краін. Ужо старанна рыхтуюцца ў «ЗАГСе» — у Летнім амфітэатры — правесці ўрачыстую афіцыйную цырымонію... Думаецца, што такое параўнанне — не «прыцягнутае за вушы», бо, калі паразважаць, так яно і ёсць. І што «дзіўна»: з гадамі «жаніх» толькі маладзее, верны сваёй вечнай «нявесце» вось ужо цэлых 20 гадоў! А нявеста штогод рыхтуе сюрпрызы, не адстае ад моды, умее «сачыць за сабой»: апранаецца ўсё больш стыльна (гэта я пра афармленне амфітэатра), заказвае дарагую парфуму з-за мяжы (лепшыя іншаземныя калектывы)...

«ЖАНІХ»... ВІЦЕБСК А «СЛАВЯНКА», «ЯК — НЯВЕСТА»

А чаму «базар»?

А самае першае «вяселле» прайшло таксама ў лістападзе. 1992 год, пасля распаду СССР — агульнай Радзімы для брацкіх народаў — прайшло яшчэ так мала часу. І тут намаганнямі энтузіястаў «нарадзілася дзіця». Кіраўнік дырэкцыі фестывалю Радзівон Майсеевіч Бас (ён, дарэчы, нядаўна стаў Ганаровым грамадзянінам Віцебска — **А.П.**), які ўсе гэтыя гады з'яўляецца «хросным бацькам» фестывалю, памятаецца, узгадваў як у маскоўскім рэстаране «Славянскі базар» разам з расійскімі партнёрамі абмяркоўвалі нюансы будучага фестывалю.

Памятаецца, яшчэ, што спачатку сама назва фестывалю (а дакладней цюркскага паходжання слова «базар») выклікала шмат пытанняў. Маўляў, як можна спалучыць «славянскі» і «базар»?

А што выклікала сумненні? Куды кожны з нас у дзяцінстве хадзіў з бацькамі, сваякамі, сябрамі? На базар! І на звычайным базары, якіх паўсюды шмат, так прыемна было, калі добрыя гандляры частавалі цябе — малога — ягадамі, яблычкам. І на фестывальным «базары» «частуюць» дарослых і дзяцей тым, чаго душа пажадае.

«Базар» добра ўпісваецца ў назву яшчэ і таму, што насамрэч у маладых канкурсантаў традыцыйнага конкурсу маладых выканаўцаў ёсць шанс заявіць пра сябе, па-добраму «прадаць» свой талент. Унікальнай падзеяй сёлетняга фестывалю стане канцэрт з удзелам былых «выдатнікаў» школы «базара» — тых, хто менавіта дзякуючы поспеху на гэтым фестывалі і стаў потым «зоркай». Што тычыцца цяперашніх маладых канкурсантаў, за Гран-пры і іншымі «сланамі» з прэміямі ў «цвёрдай» валюце будуць змагацца прадстаўнікі дваццаці краін. Беларусь прадставіць прыгажуня Алена Ланская. А ў рамках дзіцячага конкурсу нашу краіну прадставіць юная мінчанкі Аляксандра Няхай і Ганна Атрошчанка. Між іншым, якое прыгожае і вельмі «знакавае» прозвішча «Няхай»! Няхай перамогуць усе. Удачы вам, зямлячкі!!!

Якім ты быў, першы?

Старажылы горада Віцебска, напэўна, добра памятаюць, якім быў самы першы «базар». Хто нешта забыў, могуць перачытаць газеты тых часоў, наведаць музейную экспазіцыю, прысвечаную гісторыі «базара». Экспазіцыя прадстаўлена ў самым цэнтры горада — побач з Летнім амфітэатрам.

18 ліпеня 1992 года яшчэ да афіцыйнага адкрыцця міжнароднага музычнага фестывалю «Славянскі базар» (такой была назва — **А.П.**) у амфітэатры з сольным канцэртам выступіў Валерый Лявонцьеў. І шчыра ацаніў расцінаюць публікі. І вось пасля гэтага, тады ж — 18 ліпеня роўна ў 22.00 — на сцэне з'явіліся абаяльныя вядучыя — прадстаўніцы трох брацкіх краін (Расіі, Беларусі і Украіны) і аб'явілі аб адкрыцці фестывалю. Ад Беларусі вядучай была папулярнейшая ў тыя гады тэлевізійная «зорка» Зінаіда Бандарэнка, з Масквы весці «базар» прыехала Святлана Маргунова... Цікава, што тады ўрадавай «маланкай» прыйшла на «базар» тэлеграма з віншаваннямі ад першага прэзідэнта Расіі Барыса Ельцына...

Калі на гэтай старонцы паспрабаваць надрукаваць спіс усіх канцэртаў, спектакляў і іншых мерапрыемстваў, якія пройдуць у рамках сёлетняга юбілейнага фестывалю, то не хопіць месца. А ў 1992-м фестываль, зразумела, быў параўнальна небагатым на падзеі. Як той наш «жаніх» — толькі з гадамі пабагацеў пачэснай працай і старанным сваім. Тады, у 1992-м, як сведчыць «летапіс» фестывалю, у Летнім амфітэатры прайшлі менш за дзесяць канцэртаў. Ды і «базар» у цэлым сабраў «усяго толькі» трохі больш за 1000 удзельнікаў з краін, якія па пальцах можна было лёгка пералічыць. Затое ўжо тады былі ўдзельнікі з-за акіяна: нават з Аўстраліі, ЗША, Канады... Сёлета, як і ў мінулыя гады, колькасць удзельнікаў, гасцей фестывалю вымяраецца тысячамі. І ўжо зусім немагчыма вызначыць колькі людзей прыязджаюць у фестывальныя дні ў Віцебск.

Успамінаецца, што падчас самага першага «базара», калі паралельна святкавалі Дзень горада Віцебска, апошні падзялілі для правядзення канцэртаў культурных дэлегацый краін-заснавальніц фестывалю. Плошчу 1000-годдзя, насупраць атэля «Віцебск», аддалі нашым, плошчу Свабоды — расіянам, прадстаўнікам Украіны — пляцоўку каля цяперашняй канцэртнай залы «Віцебск».

Улічваючы, што на ўвесь свет Віцебск вядомы тым, што тут жылі і працавалі вядомыя мастакі, праявілі культурную, вельмі сімвалічную акцыю ў памяць творчага аб'яднання «заснавальнікаў новага мастацтва», якое дзейнічала ў правінцыйным горадку ў пачатку 1920-х.

Падарункі «нявесце» ад «жаніха»

Калі б не «базар», Віцебск не быў бы такім, як сёння. Безумоўна, гасцям заўсёды хочацца паказаць прыгожы горад. Таму радзіму фестывалю карпатліва, гадамі ўпрыгожвалі, наводзілі лоск, стваралі і пашыралі інфраструктуру для прыёму гасцей. Трэба ж недзе і пакарміць добра, і даць начлег... Колькі разоў, дарэчы, прыходзілася чуць ад іншагародніх, што яны «па-беларуску» зайздросцяць Віцебску: чаму «базар» у вас, а не ў нашым горадзе? Ды лёс такі ў Віцебска. Яшчэ ж да распаду СССР у Віцебску праводзілі фестывалі польскай песні — для гэтага і пабудавалі амфітэатр. А ўсё таму, што Віцебск сябраваў з польскім курортным гарадком, дзе праводзілі фестывалі савецкай песні.

Традыцыяй у дзень афіцыйнага адкрыцця «базара» стала «здача пад ключ» новых аб'ектаў сацыяльнага прызначэння. І радзільны дом, памятаю, адкрывалі, і першую чаргу спартыўнага комплексу.

А сёлета... Задоўга да афіцыйнага пачатку юбілейнага фестывалю столькі ўсяго пабудавалі, цалкам аднавілі самы вялікі віцебскі храм на Успенскай гары, разбураны ў 1930-я, што нават і не бяруся меркаваць што з усяго можна будзе «прэзентаваць» у якасці вясельнага падарунка.

А чаму б не зноў паўнаводную Заходнюю Дзвіну, па якой курсіруюць ажно два віцебскія цеплаходы — «Віцебск» і «Паўночная сталіца»? Напрыклад, новы корпус медыцынскага ўніверсітэта з шыкоўнай бібліятэкай, фасад якой сваёй формай «пераклікаецца» з будынкам Нацыянальнай у Мінску, а «піраміда»— гандлёвы—забаўляльны цэнтр, які пабудавалі акурат насупраць Летняга амфітэатра — усё гэта (і не толькі) можна смела запісаць як пасаг. А як зачаравала прыезджых ды і гараджан рэканструяваная плошча Перамогі — з выставай пад адкрытым небам ваеннай тэхнікі! Па перыметры плошчы шмат кавярняў і рэстаранаў. Сама плошча стала адной з пляцовак, дзе праводзяцца канцэрты і іншыя мерапрыемствы.

Афіцыйна сёлетні «базар» распачынаецца **8-га ліпеня**, а завяршаецца **14-га**. Але ж і да гэтага часу, і пасля ў тым жа Летнім амфітэатры пройдуць канцэрты. У прыватнасці, 6 ліпеня ў амфітэатры пакажа эксклюзіўнае музыкальнае феерычнае шоу (з лазернымі промнямі і іншымі спецыяльнымі эфектамі) французскі гурт «Спейс», 7-га — выступаюць Надзея Кадышава і ансамбль «Залатое кальцо»...

Ды што пералічваць: чытайце ў інтэрнэце афіцыйную праграму ды і прыязджайце. Дарэчы, доўгачаканы сучасны падарунак «нявесце» — магчымасць набыць білеты на «базар» праз «сусветнае павуцінне».

Чаго не зробіш яшчэ для каханай?!

Старажыл «базара»
Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Надвор'е

БЛІЖЭЙ ДА ВЫХАДНЫХ ПАЦЯПЛЕЕ

Паведаміла БЕЛТА начальнік аддзела метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Людміла ПАРАШЧУК.

У бліжэйшыя суткі надвор'е ў Беларусі будзе вызначаць цыклон з цэнтрам над Бранскай вобласцю Расіі. Перамяшчаючыся ў далейшым на тэрыторыю нашай краіны, ён абумовіць у першай палавіне тэтага тыдня дажджлівае надвор'е.

У сераду на значнай частцы тэрыторыі пройдуць дажджы, месцамі моцныя. У асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра ў начныя гадзіны не перасягне плюс 10-17 градусаў. Днём чакаецца 20-26 градусаў цяпла.

Характар надвор'я 7 ліпеня істотна не зменіцца. Але з пятніцы ў атмасферы намячаецца перабудова. Захаваецца паўднёва-заходні вецер, які будзе пастаўляць больш цёплае паветра ў Беларусь з поўдня Еўропы. З кожным днём будзе станавіцца цяплей.

Ноччу 8 ліпеня чакаецца плюс 12-17 градусаў, днём — ад 22 градусаў цяпла на паўночным усходзе да 29 градусаў вышэй за нуль на паўднёвым захадзе краіны.

У бліжэйшыя выхадныя цёплае паветра распаўсюдзіцца на ўсю тэрыторыю краіны. Тэмпература паветра ўначы будзе ад 14 да 20 градусаў цяпла. Днём чакаецца плюс 23-29 градусаў, па поўдні Брэсцкай і Гомельскай абласцей прагназуецца 30-32 градусы вышэй за нуль. Пераважна па паўночна-заходняй палавіне краіны пройдуць кароткачасовыя навальнічныя дажджы.

Абзац

◢ Паблізу вёскі Слагавішча Лагойскага раёна на полі перакуліўся трактар МТЗ-1221 з кіроўцам і двума пасажырамі. Ніхто не загінуў, аднак кіроўцу, 1985 г.н., зацяснула нагу колам трактара. Вызваліцца яму дапамаглі выратавальнікі з прымяненнем спецабсталявання. Трактарыста даставілі ў бальніцу. Дарэчы, перавозка пасажыраў у трактары забароненая. Высвятляюцца ўсе абставіны здарэння, у т.л. ужыванне кіроўцам і пасажырамі алкаголю.

◢ **У Верхнядзвінскім раёне разбіўся п'яны матацыкліст без правоў. Студэнт (19 гадоў) не справіўся з кіраваннем матацыкла і з'ехаў на ўзбочыну, дзе ўрэзаўся ў дрэва. Моташлема на хлопцы не было. Пасажыр, які з ім ехаў, не пацярпеў, ён патэлефанаваў бацьку студэнта. Бацька прыехаў і адвёз сына на гужавой павозцы дадому, дзе той памёр. Падрабязнасці трагедыі высвятляе ДАІ.**

◢ Непадалёк ад в. Баравое Лельчыцкага раёна грузавік ДАФ пераехаў мужчыну, які ляжаў на дарозе. ДТЗ адбылося ў цёмны час сутак. Аўтамашына ДАФ з паўпрычэпам пераехала чалавека, які ляжаў на раздзяляльнай паласе. Ад атрыманых траўмаў ён памёр на месцы здарэння.

◢ **У Мінску на Даўгінаўскім тракце 60-гадовы кіроўца грузавіка «МАЗ» збіў пажылую жанчыну, якая пераходзіла дарогу па нерэгуляваным пешаходным пераходзе. З цяжкімі траўмамі яна была дастаўлена ў бальніцу, дзе памерла.**

Поўны абзац

◢ У Брытаніі 86-гадовая Джаан Ірбон правісела ў падвале амаль 30 гадзін уніз галавой пасля таго, як выпадкова спатыкнулася на лесвіцы. Нага бабулі была заціснутая паміж лесвіцай і дзвярыма склепа, і пажылая жанчына апынулася ў вісячым стане на 27 гадзін. Да ўсяго лямпачка ў склепе перагарэла, і бабулі давялося ўвесь гэты час знаходзіцца амаль у поўнай цемры да таго часу, пакуль яе не вызвалілі выратавальнікі, выкліканыя сяброўкай. Тым не менш, смелая Джаан не страціла пачуцця гумару. На пытанне, ці не было ёй страшна ў падвале адной, яна адказала: «Не, са мной жа былі кажаны». Зараз бабуля лечыцца ад гіпатэрміі і ран на назе і не губляе пазітыўнага стаўлення да рэчаіснасці: «Здаралася ў жыцці і горшае...»

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Жыццялюбы

ЁСЦЬ ТАКАЯ ПРАФЕСІЯ — ЛЮДЗЯМ СВЯТЛО ПРЫНОСІЦЬ,

альбо Як карэспандэнт «Звязды» разам з брэсцкім ліхтаршчыкам Кірысюком праводзіла і сустракала сонца

ТУРЫСТЫЧНУЮ прыцягальнасць Брэста звычайна звязваюць з Брэсцкай крэпасцю, але, пераканалася на свае вочы, ёсць там яшчэ на што падзівіцца... Два гады таму, у ліпені, «гарадскі галава» падпісаў «наказ» аб увядзенні ў горадзе пасады ліхтаршчыка. Каб той «штодзённа ліхтары запальваў» на радасць людзям.

«МАШЫНУ ХАЧУ! ЗАМУЖ ХАЧУ!»

Бесклапотны летні вечар. На пешаходнай вуліцы Савецкай людна. Кожны бавіць час па-свойму. Адны п'юць каву ва ўтульнай кавярні, другія мілуюцца на лавачках, у якіх тут недахопу няма, трэція няспешна прагульваюцца...

Усеагульная ўвага пераключылася на камень з наказам, з-за якога паказаўся падцягнуты чалавек у сінім мундзіры з металічнай лесвіцай у руках, як толькі «прабіла» дзесяць гадзін.

Я, разам з іншымі, з непадробленай дзіцячай цікаўнасцю назіраю, як ліхтаршчык па-майстэрску прыстаўляе лесвіцу да ліхтарнага слупа. Узбіраецца па ёй, адчыняе дзверцы каванага пад даўніну ліхтара, у якім за шклом знаходзіцца звычайная газавая лямпа, і запальнічкай, прымацаванай ланцужком да рэменя ўніформы, «запальвае святло». Выконвае рытуал артыстычна, няспешна, як усе ахвотныя паспелі зрабіць фотаздымак на памяць. Затым акуратна зачыняе дзверцы, спускаецца ўніз і, горда трымаючы сваю ношу, крочыць да наступнага ліхтара.

Увесь час, пакуль Віктар Пятровіч пераходзіць са сваёй лесвіцай ад ліхтара да ліхтара, яго суправаджаюць дарослыя і дзеці. У рэшце рэшт школьніца, якая прыехала з Пінска ў Брэст на экскурсію, асмельваецца і просіць у ліхтаршчыка дазволу дакрануцца да гузіка на мундзіры. На шчасце. Апошнія, адпаліраваныя за два гады сотнямі пальцаў, бліскучаць на адлегласці. За самай смелай выстройваецца чарга. Адны заплюшчваюць вочы і асцярожна, быццам баючыся спудзіць запаветнае жаданне, трымаюцца за гузік; іншыя што ёсць моцы націраюць пальцам бляху на рамяні.

— Жаданні, загаданыя побач з вамі, сапраўды спаўняюцца? — цікаўлюся ў ліхтаршчыка, калі чарга даходзіць да мяне.

— Кажуць, што спаўняюцца, — загадкава ўсміхаецца прадстаўнік рамантычнай прафесіі. — Многія ўжо падыходзілі і дзяліліся сваёй радасцю. Думаю, людзям абавязкова трэба ў нешта верыць. А як жа без веры?

— І што звычайна людзі загадваюць?

— Рознае сабе жадаюць. Хто камп'ютар, хто веласіпед, хто фотаапарат. Хто моўчкі, хто ўслых. Аднойчы стаяў на лесвіцы, а нейкая дама, тузаючы мяне за калашыну, крычала: «Машыну хачу! Замуж хачу!» Больш я яе не бачыў, таму мяркую, што яе жаданні спраўдзіліся *(усміхаецца)*.

— А ў вас самога ёсць запаветнае жаданне?

— Хачу *(на імгненне задумваецца)*, каб усе, у тым ліку мае дзеці і ўнукі, былі здаровымі. Будзе здароўе — тады і веласіпед, і машына, і муж будуць у радасць.

«Наказ» аб увядзенні пасады ліхтаршчыка і яго абавязках, падпісаны мэрам горада, днём і ноччу ахоўвае кажан з ліхтаром у кіпцюрах — сімвал таго, што у Брэсце ніколі не наступіць цемра.

«МОЙ ДЗЕДА. НЕ ДАМ!»

Бадай, ні ў адной краіне свету не знойдзеш сёння чалавека, у працоўнай кніжцы якога значылася б прафесія ліхтаршчыка. Так што абаяльны і сціплы Віктар Пятровіч Кірысюк, можна сказаць, унікум у сваім родзе.

— У мяне людзі часта пытаюцца: «А ў вас гэта спадчыннае?» Так, жартую, у дзяцінстве ўрокі разам з братамі і сёстрамі за адным сталом вучыў пры святле газавай лямпы. Тады, ды і пасля, — прызнаўся электрык з 30-гадовым стажам, — я і падумаць не мог, што стану мясцовай знакамітасцю, дзякуючы... газавым лямпам.

На пасаду ліхтаршчыка, як высветлілася, праводзіўся строгі адбор. Адміністрацыя КУП «Брэстгарсвятло» не адзін дзясятак кандыдатаў разгледзела. У рэшце рэшт «уключаць» Савецкую даверылі самаму вопытнаму работніку. Выбіралі па многіх крытэрыях. Ацэньвалі знешнія даныя, бо далёка не кожнаму да твару такі мундзір. Правяралі на камунікабельнасць: наўрад ці маўклівы ці раздражнёны чалавек стаў бы ўсеагульным любімцам. Не апошнюю ролю сыграла і адсутнасць шкодных звычак: аматар выпіць ці заядлы курыльшчык фізічна не справіўся б з задачай, бо падымацца і спускацца па лесвіцы 68 разоў у суткі не так ўжо і проста, як падаецца збоку.

— Палічылі, што за год я толькі ўверхуніз па лесвіцы «наматаў» 14 (!) кіламетраў, — адзначыў ліхтаршчык.

— Віктар Пятровіч, і вы праўда «штодзённа ліхтары запальваеце, нягледзячы на дажджы праліўныя, снягі вялізныя і сцюжы лютыя»?

— Праўда-праўда. Толькі зімой значна складаней працаваць: коўзка, рукі мерзнуць. Ды і з ветрам зусім не салодка прыходзіцца: гэта ж не бензін, што загараецца імгненна ў любое надвор'е, а газа. На ўсялякі выпадак у мяне заўсёды пры сабе (ляпае па кішэні) ёсць яшчэ адна, запасная, запальнічка і запалкі. Так што без святла не застануцца гараджане.

— А хто вас замяняе, калі ідзяце ў водпуск альбо на бальнічны?

— Я ўжо два гады як не быў у водпуску. І ні разу за гэты час, цьфу-цьфу, сур'ёзна не хварэў. Былі балячкі, але падлечышся і выходзіш на працу. Ні выхадных няма, ні свят, ні двайніка.

— Дык вам трэба зменшчыка маленькага расціць, — прамовіў турыст з Мурманска, які з цікаўнасцю лавіў кожнае слова ліхтаршчыка.

— Вунь зменшчык, у машыне мяне чакае. Унучка мая, Даша. Яна тут ужо як свая. Ніколі не забудуся, калі дачка прывяла яе першы раз паглядзець, як дзядуля запальвае ліхтары. Даша, калі ўбачыла, што іншыя дзеці дакранаюцца да мяне, расхвалявалася і заплакала: «Мой дзеда. Не дам!»

— Віктар Пятровіч, вы выглядаеце надзвычай бадзёра, хоць, наколькі я разумею, кладзяцеся спаць позна і ўстаяце рана.

— Так, пакуль запалю ліхтары, пагавару з людзьмі, сфатаграфуюся... Карацей, кладуся спаць недзе а дванаццатай гадзіне ночы. А праз чатыры гадзіны — пад'ём. Таму такі худы *(жартуе)*. А калі сур'ёзна, днём дасыпаю тое, што ноччу недаспаў. Як па мне, лепш недаесці, чым недаспаць.

Ліхтаршчык запальвае апошні з 17 ліхтароў — і ва ўсім горадзе тут жа ўключаецца астатняе сучаснае вулічнае асвятленне. Хочацца задаць ліхтаршчыку яшчэ некалькі пытанняў, але яго ўжо нехта паклікаў: «Пятровіч, паехалі!».

«Аднойчы стаяў на лесвіцы, а нейкая дама, тузаючы мяне за калашыну, крычала: «Машыну хачу! Замуж хачу!» Больш я яе не бачыў, таму мяркую, што яе жаданні спраўдзіліся».

Не ўсе ведаюць, што ў Брэсце ёсць і каваны ліхтаршчык. Скульптура знаходзіцца побач з уваходам у «Брэсттарсвятло».

— А можна, я раніцай прыйду? — знаходжуся.

— Вы будзеце падымацца так рана? — недаверліва прамовіў Віктар Пятровіч. — Ну, калі так, да заўтра.

«КОЖНЫ З НАС У ДУШЫ МАЛЕНЬКІ ЛІХТАРШЧЫК»

У 4.30 раніцы ліхтаршчык прыехаў гасіць ліхтары. Шчыра здзівіўся, калі ўбачыў мяне «на варце» ля валуна з наказам. «Колькі журналістаў са мной запальвалі ліхтары, а вось «тушыць» будзеце вы першая».

У такі ранні час на Савецкай бязлюдна. Калі, вядома, не лічыць нас з Віктарам Пятровічам, ды дзяўчатак, якія вяртаюцца, пэўна, з дыскатэкі. «Добры вечар!» — вітаюць яны нас. «Добрай раніцы, дзяўчаткі!» — усміхаецца ў адказ Пятровіч. «Цьфу, і праўда раніцы!» — хіхікаюць сяброўкі і знікаюць з гарызонту. «А давайце, мы вам лесвіцу будзем пераносіць», — прапаноўваюць дапамогу хлопцы нападпітку, якія, калі мы пераходзілі да чарговага ліхтара, вынырнулі з гульнявога клуба. «Дзякуй, я сам спраўлюся, — ветліва адмаўляецца ад дапамогі ліхтаршчык. — Вы не глядзіце, што ў бацькі вам гаджуся, у душы я нашмат маладзейшы».

Менавіта па гэтым гадзінніку, які размешчаны на пачатку вуліцы, можна даведацца, калі з'явіцца ліхтаршчык і запаліць першы ліхтар.

— За два гады штодзённай працы ў вас, пэўна, ужо з'явіліся сапраўдныя прыхільнікі?

— Не ведаю, як прыхільнікі, але варта было адгадаваць вусы, як пасыпаліся пытанні: «Ці не падмянілі нашага ліхтаршчыка?» А адна парачка з Брэста кожны дзень прыходзіла на Савецкую і фатаграфавала мяне. Можа, месяц так хадзілі. А пасля сюрпрыз зрабілі. Альбом прыгожы такі з фотаздымкамі падарылі мне.

Падзівіцца на ліхтаршчыка прыходзяць не столькі брастаўчане, колькі турысты з іншых беларускіх гарадоў ды замежных краін. Іншаземцам, заўважыў спадар Кірысюк, падабаецца ўсё, што звязана з даўніной.

— Усе глядзяць на цябе, сочаць за кожным крокам. Пытанняў шмат задаюць. Нават з чаго пашыты мой касцюм, іх цікавіць. Адна жанчына доўга цёрла тканіну і прыгаворвала: «Вой, які матэрыял добры!». Запомнілася, і як група расіян кожны запалены ліхтар вітала апладысментамі ды крыкамі «ўра!».

— А адкуль больш за ўсё турыстаў прыязджае?

— Адкуль толькі не прыязджаюць... З усяго былога Савецкага Саюза, з Канады, ПАР, Бразіліі, Японіі. Нашы дзяўчаты водзяць іншаземцаў, паказваюць горад. Усе, хто б ні прыязджаў, захапляюцца: «А ў нас такога няма. Вы малайцы!». Мяне таксама не так даўно дзяўчаты з Адэсы ў госці запрашалі. Не паехаў. Не магу ж я пакінуць гараджан без святла!

— Віктар Пятровіч, падзяліцеся сакрэтам свайго жыццялюбства, — на развітанне прашу па традыцыі суразмоўцу.

— Трэба быць добрымі, прыглядацца адзін да аднаго, не баяцца рабіць добрыя справы. Калі задумацца, кожны ж з нас у душы маленькі ліхтаршчык, які здольны падарыць святло іншаму.

— А што пажадаеце нашым чытачам? — спахапілася я, калі спадар Кірысюк ужо сеў у машыну.

— Моцнага здароўя. І абавязкова парадайце, каб прыязджалі ў Брэст загадваць жаданні, — прамовіў ліхтаршчык і яшчэ раз светла ўсміхнуўся на развітанне.

Надзея ДРЫЛА, фота аўтара.

Ад аўтара.

Ліхтаршчык Віктар Кірысюк у ліпені, напярэдадні свята горада Брэста, адзначае дзень народзінаў. Ад душы віншуем гэтага светлага чалавека з надыходзячымі святамі і жадаем, каб яго запаветнае жаданне здзейснілася.

МІНЧАНКА ТАЦЦЯНА ЖЫЛІНСКАЯ НАРАДЗІЛА ТРАЙНЮ

Мінчанка Таццяна Жылінская пазаўчора стала мамай адразу трох сыноў. Радасную навіну карэспандэнту агенцтва «Мінск—Навіны» паведаміла шчаслівая бабуля Наталля Несцярэня.

Першы малы з'явіўся на свет у нядзелю ў 11.20. З інтэрвалам у 10 хвілін нарадзіліся яшчэ два хлопчыкі. Трайняткі пакуль важаць няшмат — 480, 530 і 680 г, але яны здаровенькія і дужанькія. Таму ў хуткім часе нованароджаныя яўна пацяжэюць. Рост малых 40, 43 і 45 см.

— Мама і дзеці адчуваюць сябе добра, — гаворыць Наталля Несцярэня. — Малыя, як толькі з'явіліся на свет, адразу закрычалі! Хутчэй бы іх убачыць!

Цяпер мама і дзеці знаходзяцца ў РНПЦ «Маці і дзіця». Для 30-гадовай Таццяны, супрацоўніцы РУП «Белпошта», гэта доўгачаканыя першынцы. Наваспечанага бацьку Аляксея Жылінскага радасная вестка знайшла ў Пінску, у працоўнай камандзіроўцы. Ён паспяшаўся закончыць усе справы і вярнуцца ў Мінск.

Пра тое, што ў іх будуць трайняты, будучыя бацькі даведаліся пры правядзенні першага УГД.

Імёны для малых бацькі ўжо выбралі: Ягорка, Паўлік і Саша.

Варта адзначыць, што кожны месяц у РНПЦ «Маці і дзіця» з'яўляецца на свет мінімум адна трайня. У маі тройчы мамамі сталі чатыры мінчанкі. Усяго ў РНПЦ «Маці і дзіця» ўчора з'явіліся на свет 7 малых: тры дзяўчынкі і чатыры хлопчыкі.

Марына КАСЦЮКЕВІЧ, *«Мінск—Навіны».*

Ну і ну!

Фінансавая міліцыя выкрыла нелегальнае казіно ў Мінску

Супрацоўнікі ўпраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю па Мінскай вобласці і Мінску спынілі дзейнасць нелегальнага казіно, якое размяшчалася ў адным з забаўляльных цэнтраў у сталіцы. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе КДК.

Як растлумачылі ў камітэце, гульнявую залу ў прэстыжнай забаўляльнай установе ў цэнтры Мінска арандавала грамадская арганізацыя, створаная ў верасні 2010 года для папулярызацыі гульні ў покер. Адной з мэт арганізацыі было выяўленне патэнцыяльна моцных ігракоў для ўдзелу ў міжнародных турнірах.

Аднак, паводле даных фінансавай міліцыі, са снежня мінулага года ў памяшканні праводзіліся не толькі аматарскія гульні ў покер, а пачало дзейнічаць нелегальнае казіно. У зале працавалі чатыры сталы для покера. Наведвальнікі мелі магчымасць абмяняць грошы на фішкі, а затым правесці зваротны абмен. Як правіла, штодзень у гульні на грошы прымалі ўдзел ад 20 да 40 чалавек, казіно функцыянавала шэсць дзён на тыдзень з 22.00 да 6.00.

Арганізатар нелегальнага казіно (ён жа старшыня названай грамадскай арганізацыі) атрымліваў 5 працэнтаў ад сумы выйгрышу ігракоў. Паводле папярэдняй інфармацыі, незаконны даход 30-гадовага мужчыны склаў Br84 млн. У КДК не выключаюць, што ў ходзе следства гэта сума значна ўзрасце.

У адносінах да асноўнага падазронага ўзбуджана крымінальная справа па ч.1 арт.233 «Незаконная прадпрымальніцкая дзейнасць» КК Беларусі, якая прадугледжвае да трох гадоў пазбаўлення волі. Цяпер праводзяцца дадатковыя следчыя дзеянні для выяўлення іншых асоб, якія маюць дачыненне да арганізацыі нелегальнага казіно.

КОЖНАМУ РАЁНУ — СВОЙ БАСЕЙН

Нягледзячы на валютныя праблемы, Міншчына працягнула актыўна мадэрнізаваць сваю вытворчасць. Паводле папярэдніх ацэнак, за першую палову года ў эканоміку рэгіёна прыцягнута каля 5 трлн рублёў інвестыцый. Гэтыя грошы, як адзначыў старшыня аблвыканкама Барыс Батура, былі накіраваны на набыццё машын, абсталявання, а таксама на будаўніча-мантажныя работы.

Крыху адстала толькі вёска

Як сведчыць статыстыка, за студзень—май тэмп росту валавога рэгіянальнага прадукту склаў 11,3 працэнта. Пры гэтым Мінская вобласць забяспечыла рэнтабельнасць продажу прадукцыі, а таксама павялічыла экспарт тавараў больш чым на 36 працэнтаў — станоўчае сальда знешняга гандлю перавысіла 811 млн долараў. «Мы выканалі практычна ўсе прагнозныя паказчыкі развіцця, за выключэннем адной сферы — сельскай гаспадаркі, — зазначыў старшыня аблвыканкама. — Планавалася, што павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці сельгаспрадукцыі складзе 5,6 працэнта, на справе ж рост аказаўся практычна ўдвая меншым. Пакуль нам не ўдалося перакрыць адставанне па жывёлагадоўлі, і асабліва па малацэ. Разам з тым, у цэлым па годзе сітуацыя павінна выраўняцца».

У прыватнасці, сёлета на Міншчыне плануецца рэканструяваць і пабудаваць 70 фермаў. І ў тым ліку пабудаваць са зборных канструкцый, вытворчасць якіх наладжана ў Капылі. «Жалезабетонныя канструкцыі самыя надзейныя, прычым кошт такой фермы на 600 галоў па цяперашніх цэнах складае 16 млрд рублёў, а яе мантаж займае ўсяго месяц, — заўважыў губернатар. — І, да слова, у такіх фермах прадугледжана кожная дробязь — аж да ацяплення дапаможных памяшканняў пры дапамозе сонечных батарэй».

Увага патрэбна малым прадпрыемствам

Бліжэйшым часам у вобласці будзе рабіцца стаўка на навукаёмкія праекты і рэсурсазберагальныя тэхналогіі. Найбольш перспектыўнымі напрамкамі для рэгіёна тут з'яўляюцца мяса-малочная і пладова-агароднінная прамысловасць, а таксама транспартная інфраструктура.

Вынікам укладання інвестыцый становіцца стварэнне новых працоўных месцаў з вытворчасцю не менш за 60 тыс. долараў на аднаго работніка ў год. Так, адзін з апошніх прыкладаў. Літаральна днямі пасля рэканструкцыі адкрыўся цэх сухіх малочных прадуктаў у Валожынскім філіяле Маладзечанскага малочнага камбіната. Звыш 90 працэнтаў прадукцыі цэха пойдзе на экспарт, а 22 новыя супрацоўнікі — атрымаюць прыстойную зарплату.

— Безумоўна, сітуацыя на валютным рынку накладвае свой адбітак на эканоміку, — заўважыў Барыс Батура. — Тым не менш, самая важная задача для выканкамаў на месцах цяпер — утрымаць малыя прыватныя прадпрыемствы. І ў тым ліку гаворка аб прадпрыемствах, якія амаль цалкам працуюць на імпартнай сыравіне, але вырабляюць імпартазамяшчальную прадукцыю.

Дарэчы, не сакрэт: менавіта ад захавання невялікіх прадпрыемстваў шмат у чым залежыць малюнак на рынку працы многіх раёнаў. Нягледзячы на цяжкасці, сітуацыя тут засталася пад кантролем. Не ў апошнюю чаргу дзякуючы стварэнню 11,5 тыс. новых працоўных месцаў Мінская вобласць захавала невысокі ўзровень беспрацоўя — 0,6 працэнта. Цяпер у цэлым у службах занятасці рэгіёна знаходзіцца на ўліку 7,3 тыс. чалавек, аднак адначасова тыя ж службы занятасці могуць прапанаваць 7,8 тыс. вакансій.

Дапамога тым, хто працаваць не можа

На працягу некалькіх гадоў доля валютнага складніка ў аб'ёмах прамысловай прадукцыі была 60-80 працэнтаў. Яшчэ адна парадаксальная з'ява — высокая, на ўзроўні 70 працэнтаў, доля зарплаты ў ВУП. «Мы, па сутнасці, жылі не па сродках, і самае сумнае — прызвычаіліся да такога жыцця, — канстатаваў Барыс Батура. — Ёсць шмат прыкладаў, калі новыя і запатрабаваныя на рынку прадпрыемствы не могуць набраць людзей. Людзі не ідуць з-за цяперашняй невысокай зарплаты, і пры гэтым не зважаюць на тое, што прадпрыемства мае перспектывы, а значыць, праз некаторы час тут будуць па-сапраўднаму вартыя паказчыкі аплаты працы».

Пры гэтым губернатар заўважыў: аб'ектыўных умоў для рэзкага павышэння зарплаты ў рэальным сектары эканомікі пакуль няма. У адваротным выпадку проста паўторыцца сітуацыя з «раскруткай» інфляцыі ў красавіку-маі. Іншая справа — жорсткі кантроль за ростам цэн і сацыяльная абарона тых, хто зарабіць не можа. «Падтрымку павінны атрымліваць студэнты, нізкааплатныя работнікі бюджэтных арганізацый, але галоўнае — пенсіянеры, — зазначыў Барыс Батура. — Ужо прынята рашэнне аб аднаразовай выплаце непрацуючым пенсіянерам з невысокім узроўнем даходу. Але, магчыма, гэтага яшчэ недастаткова. На адзінокіх пенсіянераў павінны звярнуць увагу і мясцовыя органы ўлады — у выпадку неабходнасці і тут ёсць магчымасці аказваць дадатковую дапамогу».

Свята пройдзе — комплекс застанецца

Як паведаміў Барыс Батура, эканамічныя цяжкасці ніяк не паўплываюць на падрыхтоўку да рэспубліканскага свята «Дажынкі-2011», якое пройдзе ў Маладзечне. Зараз тут асвоена каля 400 млрд рублёў. Агульны ж «падрыхтоўчы каштарыс» складзе каля 700 мільярдаў.

— Асноўныя работы фактычна закончаны, засталіся толькі два найбольш цікавыя аб'екты — парк разам з амфітэатрам на 2000 месцаў у атачэнні сажалак, а таксама спартыўна-забаўляльнага комплекс, — адзначыў губернатар. — Абодва аб'екты будуць здадзены своечасова. Прычым мы разлічваем, што ў будучыні той жа спартыўна-забаўляльны комплекс стане самаакупляльным — у тым ліку тут будуць працаваць разнастайныя спартзалы, басейн, аквапарк, боўлінг.

Пры гэтым Барыс Батура заўважыў: грошы ўкладваюцца не толькі ў Маладзечна. Не менш цікавыя планы датычацца Барысава, дзе ў бліжэйшыя гады павінны з'явіцца новы мост, пуцеправод, а таксама новы стадыён. А ўвогуле кожнаму раёну вобласці выдаткавана на добраўпарадкаванне не менш чым па 2 млрд рублёў.

— Не менш важнай задачай з'яўляецца здача ў эксплуатацыю фізкультурна-аздараўленчых комплексаў у некаторых раёнах — дзе-нідзе гэтыя комплексы ператварыліся ў сапраўдныя даўгабуды, — зазначыў старшыня аблвыканкама. — Так, днямі фізкультурна-аздараўленчы комплекс ужо адчыніўся ў Любані, і на чарзе — Барысаў, Беразіно, Мядзель. А да таго ж ужо вырашана: праз нейкія год-два ўласны басейн будзе мець літаральна кожны райцэнтр Мінскай вобласці.

Сяргей ГРЫБ.

Нясвіжскі раён.

АЎТАПОЕЗД «МЕТАЛІСТАЎ»

Бліжэй да ночы ў Чачэрскім раёне, побач з вёскай Балсуны, супрацоўнікамі памежнай службы, ДАІ, АБЭЗ затрымана адразу 8 аўтамабіляў, кіроўцы якіх без суправаджальных дакументаў перавозілі лом металу. Два грузавыя «ГАЗы», «Волга», два «ВАЗы», два «Масквічы» і «Фальксваген Джэта» цягнулі ў агульнай колькасці больш за сем тон чорнага і рознакаляровага металу. Прычым адзін з «ГАЗаў» буксіраваў «Масквіч». Машыны з грузам затрыманы да канчатковых вынікаў праверкі, якую праводзіць інспекцыя па падатках і зборах па Чачэрскім раёне.

ЗГАРЭЛА СЕНА

Сенасклад КСУП «Агракамбінат «Холмеч», адной з лепшых гаспадарак Рэчыцкага раёна, загарэўся аб адзінаццатай гадзіне ночы. У вёсцы Калочын да месца пажару было накіравана 6 аддзяленняў выратавальнікаў. Яны тушылі дах збудавання і сена ў рулонах сёлетняга ўкосу, якія гарэлі адкрытым полымем. Праз гадзіну пажар быў ліквідаваны, і нават 5 тон сена атрымалася выратаваць, аднак 150 тон кармоў для жывёлы знішчана. Прычына высвятляецца, спецыялістамі МНС не выключаецца і падпал.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Кірмаш
штотыднёвы рэкламны выпуск № 27 (688)
адрэса рэкламы 287 17 79

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

❒ А/м «Форд Эскорт», 1994 г.в., хэтчбэк, добры стан, аб'ём 1,4, расход бензіну 5,5 л, 2200 у.а.
Тэл. МТС 764 42 91.

❒ Катэдж (незавершаны, гатоўнасць 76%), маскоўскі напрамак, пас. Калодзішчы, 14 сотак, вада, газ, ёсць ТУ.
Тэл. 8017 208 26 13, 8 029 642 53 22.

❒ Пліта газавая 4-канф., б/к, Расія.
Тэл. 8 029 254 06 81.

❒ А/м ЗАЗ-1102 «Таўрыя», 2003 г.в., 6000 км, ідэальны стан.
Тэл. 8 029 609 55 07.

❒ А/м «Нісан Прімера», хэтчбэк, чырвоны, 1994 г.в., 1.4, б, у добрым стане. Цана 1700 у.а. Торг.
Тэл. МТС 752 01 49.

❒ Участак у пас. Ратамка, 7 км ад Мінска, 16 сотак пад катэджныя забудовы, побач лес, цана 14500 у.а. Торг.
Тэл. 8 029 771 51 78.

❒ А/м «Фальксваген Джэта», 1992 г.в., 1,6, б, шэры метал., ц/з, 5 л/100 км, сіг., СД МРЗ, новая гума, нефарбаваная, выдатны стан, цана 2250 у.а., торг.
Тэл. 8 029 771 51 78.

❒ Рухавік, каробка да а/м W гольф 2, 1,3, б.
Тэл. МТС 583 77 27.

ЗВЯЗДА КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ

ЗАПОЎНІЦЕ РАЗБОРЛІВА, ВЫРАЖЫЦЕ І ВЫШЛІЦЕ НА АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.

Пашпарт, серыя_____ №_____ Выдадзены _____

Подпіс _____ Дата _____

Выдаткі абанентаў МТС павялічацца ў сярэднім на 10 працэнтаў

Найбуйнейшы аператар сотавай сувязі СТАА «Мабільныя ТэлеСістэмы» паведамляе пра павышэнне тарыфаў з 11 ліпеня 2011 года на некаторых тарыфных планах. Змяненні закрануць званкі ўнутры сеткі, званкі ў іншыя сеткі, SMS-паведамленні, а таксама штомесячную плату на асобных тарыфных планах.

Генеральны дырэктар СТАА «МТС» Уладзімір Карповіч тлумачыць неабходнасць павышэння тарыфаў павелічэннем выдаткаў кампаніі, а таксама планамі падоўжыць інвеставанне ў развіццё сеткі і запуск паслуг і сэрвісаў на аснове навейшых тэхналагічных рашэнняў:

— Мы пастараліся падысці да гэтага няпростага рашэння максімальна гнутка, з улікам таго, якімі паслугамі МТС і ў якім аб'ёме карыстаюцца нашы кліенты. Без змянення застануцца цэны на паслугі інтэрнэта, асобныя сегментаваныя тарыфы («Асаблівы», «Блізкі. Для пенсіянераў»), а таксама абавязацельствы па абсталяванні, якое набывалася ў растэрміноўку. У выніку, па нашых падліках, у сярэднім штомесячныя выдаткі абанента МТС павялічацца ў беларускіх рублях на 10 працэнтаў.

Больш падрабязна з новымі тарыфамі можна будзе азнаёміцца з 10 ліпеня на сайце www.mts.by, па тэлефоне даведачна-інфармацыйнай службы 0890 (кругласутачна з мабільнага тэлефона ў сетцы МТС бясплатна) ці па гарадскім нумары 237 98 98.

На сённяшні дзень МТС абслугоўвае ў Беларусі 4 мільёны 752 тысячы абанентаў. Сярод карпаратыўных кліентаў МТС — 87 кампаній, якія ўваходзяць у ТОП-100 найбуйнейшых падаткаплацельшчыкаў краіны. Тэхнічная інфраструктура сеткі МТС уключае 4,2 тысячы базавых станцый, якія штодня апрацоўваюць больш як 18 мільёнаў званкоў амаль у 22 тысячах населеных пунктаў Беларусі. Зараз асноўныя капіталаўкладанні ажыццяўляюцца ў развіццё сеткі 3G і ўкараненне новых тэхналагічных рашэнняў і платформаў, перш за ўсё звязаных з удасканаленнем паслуг мабільнага доступу ў інтэрнэт. А ў 2011 годзе кампанія прыступіла да засваення сувязі «чацвёртага пакалення». Вясной МТС паспяхова правяла тэсціраванне сеткі LTE ў Беларусі.

За 9 гадоў работы кампаніі агульная працягласць размоў яе абанентаў склала 130 398 182 076 хвілін, або 250 тысяч гадоў. Таксама за 9 гадоў абаненты МТС напісалі 2 641 740 905 SMS. Калі для нагляднасці перавесці гэтыя паведамленні ў фармат А4 , то друкаваная SMS-спадчына абанентаў МТС склала б твор аб'ёмам у 45 мільёнаў старонак — раман «Вайна і Мір» накладам 30 тысяч экзэмпляраў. Рэкордная колькасць SMS, адпраўленых адным абанентам МТС за месяц, — 6 265. Атрымліваецца, што аўтар набіраў у сярэднім 208 паведамленняў у суткі ці 9 SMS кожную гадзіну. А напрыканцы 2010 года адзін з абанентаў МТС устанавіў проста фантастычны рэкорд: на працягу месяца ён быў «на провадзе» 28 372 хвіліны або амаль 20 сутак.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Публикацию годового баланса УСП «Седьмая линия» «Приорбанк» ОАО за 2010 год, опубликованную в газете «Звязда» от 9 апреля 2011 г. № 66 (26930) СЧИТАТЬ НЕДЕЙСТВИТЕЛЬНОЙ.

УНП 806000018

7 Седьмая линия
Унитарное страховое предприятие

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС за 2010 год
УСП «СЕДЬМАЯ ЛИНИЯ» «ПРИОРБАНК» ОАО

220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 65А

(тыс. руб.)

АКТИВ	СУММА	ПАССИВ	СУММА
1	2	3	4
Основные средства (по остаточной стоимости)	65 876,6	Уставный фонд	3 372 000
Нематериальные активы (по остаточной стоимости)	12 411,2	Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей)	
Доходные вложения в материальные ценности (по остаточной стоимости)		Резервный фонд	31 304,5
Вложения во внеоборотные активы		Добавочный фонд	63 554,4
В том числе: незавершенное строительство		Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	0
Прочие внеоборотные активы		Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток)	2 073 578,8
Запасы и затраты	40 678,8	Целевое финансирование	
В том числе: сырье, материалы и другие аналогичные активы	35 796,4	Доходы будущих периодов	35 612,7
расходы будущих периодов	4 882,4	Страховые резервы и фонды – всего	14 795 905,6
прочие запасы и затраты		В том числе: страховые резервы	14 843 435,3
Доля перестраховщиков в страховых резервах		фонды предупредительных (превентивных) мероприятий, гарантийные и иные фонды, образованные в соответствии с законодательством	-47 529,7
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более чем через 12 месяцев после отчетной даты)		Долгосрочные кредиты и займы	
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты)	37 247	Прочие долгосрочные обязательства	
Расчеты с учредителями		Краткосрочные кредиты и займы	
В том числе: по вкладам в уставный фонд		Кредиторская задолженность – всего	157 02,5
Денежные средства	10 035 617,4	Задолженность перед участниками (учредителями)	
Финансовые вложения	10 198 207	Резервы предстоящих расходов	2 379,5
Прочие оборотные активы		Прочие краткосрочные обязательства	
БАЛАНС	20 390 038	БАЛАНС	20 390 038

ПЕРЕЖИРСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

Пуховичского района Минской области проводит открытый аукцион по продаже земельных участков для строительства и обслуживания жилого дома гражданам Республики Беларусь, расположенных на территории сельсовета

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь земельного участка (га)	Наличие инженерных сетей	Расходы по подготовке документации (рублей)	Начальная цена (рублей)	Задаток (рублей)
1	д. Рыбцы, ул. Придорожная, д. 4 624484808101000222	0.1631	Электр., газ. ЖД-сооб.	1228767	19 000 000	1 900 000
2	д. Рыбцы, ул. Придорожная, д. 8 624484808101000221	0.1630	Электр., газ. ЖД-сооб.	1202525	19 000 000	1 900 000

Задаток перечисляется на р/с 3600625130005 в ЦБУ № 626 г. Марьина Горка, ф-л № 500 МУ ОАО «АСБ Беларусбанк» в 222810 г. М. Горка, ул. Ленинская, 27. БИК 153001601. УНН 600177731. ОКПО 04429668. Код платежа 04901. Пережирский сельисполком.

Порядок проведения аукциона оговорен в Положении о его проведении. Аукцион состоится **27 июля 2011 года в 15.00** по адресу: д. Пережир, ул. Гуриновича, 2 «а» (здание исполкома) Пуховичского района Минской области. Заявление на участие и необходимые документы принимаются **по 21 июля 2011 года до 17.00** по вышеуказанному адресу.

Телефон: (801713) 78823, 78835, 78836. Сайт в интернете Пуховичского райисполкома.

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» 8 августа 2011 г.
проводит открытый аукцион № 03-Сф-11 по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь

Минский городской центр недвижимости

Вид аукциона: открытый (на повышение цены продажи).
Предмет аукциона: право частной собственности на земельный участок.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляются 5 земельных участков, расположенных в Заводском районе г. Минска для строительства и обслуживания одноквартирных (блокированных) жилых домов:

№ п/п	Месторасположение земельного участка	Кадастровый номер земельного участка	Площадь земельного участка, га	Начальная цена, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.	Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, бел. руб.
1	2	3	4	5	6	7
1.	ул. Иркутская, 110	500000000002007568	0,0517	226 251 608	22 000 000	2 134 249
2.	ул. Фучика, 1	500000000002007566	0,0498	217 936 752	21 000 000	2 134 249
3.	ул. Фучика, 2	500000000002007567	0,0525	229 752 600	22 000 000	2 134 249
4.	ул. Фучика, 7	500000000002007565	0,0574	251 196 176	25 000 000	2 134 249
5.	ул. Федотова, 31	500000000002007569	0,0544	248 888 704	24 000 000	2 134 249

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках содержатся в составе землеустроительной документации.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выдаваемыми эксплуатирующими и согласующими организациями.

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона:

внесение победителем аукциона платы за земельные участки;

возмещение им расходов, связанных с подготовкой и проведением аукциона и формированием этих земельных участков, в том числе с государственной регистрацией создания земельных участков;

осуществление в двухмесячный срок после принятия Минским горисполкомом решения о предоставлении победителю аукциона земельных участков государственной регистрации прав на них в РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;

получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома;

занятие (освоение) земельных участков осуществить не позднее одного года после получения свидетельства о государственной регистрации прав на них.

Аукцион состоится 8 августа 2011 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Для участия в аукционе необходимо:

внести задаток в размере, указанном в графе 6 (в случае участия в торгах в отношении нескольких земельных участков – в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04901, получатель – финансовое управление Мингорисполкома (задатки вносятся в белорусских рублях в суммах согласно настоящему извещению);

представить в УП «Минский городской центр недвижимости» следующие документы:

заявление на участие в аукционе установленной формы;

заверенную банком копию платежного документа о внесении задатка в установленном размере;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, в соответствии с которым участник аукциона, которому по результатам аукциона в установленном порядке предоставляется земельный участок, обязан возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

дополнительно представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане и представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6 с 6 июля по 2 августа 2011 г. по рабочим дням в рабочее время.

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победители торгов (участники аукциона, которым земельные участки предоставляются как единственным, подавшим заявление на участие в аукционе) в течение 10 рабочих дней со дня принятия Минским горисполкомом решений о предоставлении им соответствующих земельных участков обязаны:

внести плату за земельный участок (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);

возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре;

возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком выдает выписку из решения о предоставлении земельного участка в частную собственность.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона Минский горисполком может предоставить победителю аукциона рассрочку внесения платы за земельный участок, предоставляемый в частную собственность, в установленном порядке.

Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Контактный телефон: **+ 375 (17) 226 16 72**, официальный сайт организатора торгов **www.mgcn.by.**

Нашы карані

Свята перамогі Святла над Цемрай

КУПАЛЛЕ па звыклай традыцыі святкуецца ў ноч з 6 на 7 ліпеня. Аднак першапачаткова, у паганскія часы, яно адзначалася менавіта ў дзень летняга сонцастаяння (21 ці 22 чэрвеня па сучасным календары).

— З астралагічнага і астранамічнага пункту гледжання, 6 і 7 ліпеня не маюць асаблівай сэнсавай нагрузкі, у адрозненне ад часу летняга сонцастаяння, — патлумачыў **астролаг Уладзімір ВАСЮК.** — З-за розніцы паміж новым і старым каляндарнымі стылямі свята пасунулася ад сваёй ранейшай спрадвечнай даты, хоць і захавала сваю абрадавасць і сімволіку. Аднак сутнасць Купалля, як і многіх іншых старажытных свят, засталася прыхаванай. Глыбінны сэнс Купалля звязаны з ПОЎНАЙ ПЕРАМОГАЙ СВЯТЛА НАД ЦЕМРАЙ.

Па словах Уладзіміра Васюка, усе свае святы нашы продкі ўвязвалі з астранамічнымі з'явамі і нябеснымі аб'ектамі, бо такая ўзаемасувязь дазваляла з найменшымі намаганнямі дасягнуць найлепшых вынікаў, зрабіць род, сям'ю больш жыццяздольнымі. Купалле мела дакладную астранамічную прывязку да дня летняга сонцастаяння (калі наставаў самы доўгі дзень і самая кароткая ноч). Менавіта на гэты час прыходзілася максімум святла.

— Святло заўсёды асацыявалася з агнём, рухам, радасцю. Святкаваць пачыналі са світання самага доўгага дня ў гадавым коле. Радаваліся перамозе святла над цемрай. Гэта і з'яўлялася сакральным сэнсам свята, — адзначыў астролаг. — Адсюль вынікае, што Купалле ўсё ж больш правільна адзначаць у адпаведнасці з астранамічным цыклам — у дзень летняга сонцастаяння, як гэта рабілі нашы продкі.

Самы доўгі дзень нясе шмат станоўчай творчай энергіі. Апроч таго, што гэтае свята Святла, гэта яшчэ і свята Агню (агонь у гэты дзень меў вялікую ачышчальную сілу), таму большасць абрадаў у гэты дзень была звязана з вогненнай сімволікай.

— Усе мы ведаем, што на Купалле прынята скакаць цераз вогнішча і пускаць з узгорка запаленае кола (сімвал сонца), вадзіць карагоды, у якіх адбівалася сімволіка руху агню ад цэнтра да перыферыі, з выткаў агню нябеснага да жыцця зямнога.

Па словах астролага, у гадавым цыкле продкаў беларусаў існавалі чатыры «вогненныя» святы, прымеркаваныя да найбольш значных праяў Сонца (Купалле, Багач, Каляда і Ярылаў дзень). Прычым падчас кожнага са свят агонь выступаў у розных іпастасях. Купалле — гэта адкрыты агонь, агонь у сваім максімальным праяўленні, полымя, што стварыла наш свет («Калі правесці паралель з сучаснасцю, то можна сказаць, што купальскі агонь падобны на імпульс спартсмена, які дабіваецца асабістага ці сусветнага рэкорду сілы, хуткасці, спрытнасці», — патлумачыў астролаг). Агонь, схаваны ўнутры любой прыроднай формы, у тым ліку і ў чалавеку, быў сімвалам восеньскага раўнадзенства («Гэтае «вогненнае» свята звязана з той праявай агню, якая ўтварыла нашу рэчаіснасць такой, якой яна з'яўляецца. Больш зразумелы сімвал — ганчарны выраб, які майстар толькі што дастаў з печы для абпальвання. Агонь печы быў увабраны глінай і ўвасобіўся ў канкрэтнай форме»).

Агонь, які захоўвае канкрэтныя праявы нашага свету, атаясамліваўся з зімовым сонцастаяннем («Гэта сімвал унутранага агню чалавека, прыроды, які з часам знойдзе сваю праяву ў канкрэтных формах. Найбольш зразумелая сімволіка — навуковец, які шукае шляхі ўвасаблення на практыцы сваіх ідэй»).

Агонь, які толькі нараджаўся, атаясамліваўся з веснавым раўнадзенствам. («Ён звязаны з першасным імпульсам творчасці прыроды, чалавека. Гэта сімвал новага цыклу стварэння, пачатку новага імпульсу вогненнай творчасці. Кожны раз, калі мы запальваем сярнічку ці вогнішча на прыродзе, момант, калі з'яўляюцца першыя языкі полымя, можна лічыць увасабленнем агню вясенняга раўнадзенства».)

Купалле — свята радасці. Напярэдадні яго людзі абносілі агнём жытло, запальвалі свечкі. Гэта дзень добрага настрою, гумару, розыгрышаў.

Пасля Купалля (ці непасрэдна перад ім) адзначаўся Русальны тыдзень («У творчага агню ёсць мужчынскае ўвасабленне — Купала і жаночы аспект творчасці, які ўвасабляўся ў Русальным тыдні»). Гэта час свабоды праяўлення ўласных жаданняў і сіл уradлівасці.

— Сонца ў свядомасці старажытных людзей атаясамліваўся з радасцю, якая праяўлялася ў тым ліку і ў падаўжэнні роду, — патлумачыў Уладзімір Васюк. — Сонца выпраменьвае на Зямлю энергію, якая ўвасабляецца ў канкрэтных формах. Творчая энергія сонца, якая ўвайшла, напрыклад, у зерне, абавязкова дасць усходы. Такім жа чынам і дух чалавека, паглыблены ў матэрыю, таксама дасць «парасткі». Гэта сакральны сэнс русальных абрадаў.

Падчас Русальнага тыдня жанчынам і мужчынам трэба было наблізіць сваю душу і цела да прыроды. Напрыклад, да нашых часоў дайшоў звычай у гэты тыдзень — на світанні, ці ўвечары, калі садзіцца сонца, хадзіць басанож па расе. Лічылася, што набліжэнне да прыроды, дакрананне да яе ў гэты перыяд дае магчымасць атрымаць жыватворчую сілу сонца.

— Многія этнографы мяркуюць, што Русальны тыдзень пачынаўся да Купалля, некаторыя — што пасля яго. Гэтую спрэчку можна вырашыць, калі ўзгадаць астранамічную прывязку да каляндарнага цыклу старажытных людзей. Русалка — гэта сімвал жанчыны, здольнай да творчасці, у тым ліку і да нараджэння дзяцей. І не трэба засяроджваць увагу на тым, што яна напалову рыба. Гэта сімвал, які аб'ядноўвае ў сабе два іншыя сімвалы — ваду і чалавека. Вада дае жыццё, мы ўсе выйшлі з вады. Жанчына — таксама здольная даваць жыццё. Русальны тыдзень часта блытаюць з Купаллем. Сімвал Русальнага тыдня — жанчына, якая рыхтуецца стаць маці ці ўжо гадуе дзяцей. Русальны тыдзень — свята жаночага ўвасаблення сонечнага прынцыпу.

З пункту гледжання астралогіі, русалка — гэта маладзік, які расце да поўні, таму можна меркаваць, што Русальны тыдзень наступаў менавіта ў перыяд з'яўлення маладзіка, адразу перад днём летняга сонцастаяння, ці адразу пасля яго, адзначыў астролаг. Такім чынам, Русальны тыдзень мог быць як перад Купаллем, так і пасля яго — у залежнасці ад фазы Месяца.

Падсумоўваючы вышэйсказанае, Уладзімір Васюк яшчэ раз падкрэсліў, што Купалле — свята з пэўным астранамічным падтэкстам (летнім сонцастаяннем). Яго сэнс — поўная перамога святла над цемрай, і адпаведна толькі ў самы доўгі дзень года ён мае сэнс.

Інга МІНДАЛЁВА.

Ну і ну!

СПАТРЭБІЎСЯ ПЛОТ

Ноччу з двара дома ў в. Ківаціч (Кобрынскі раён) невядомыя ўкралі 29 пралётаў металічнага плота. Было ўстаноўлена, што пралёты выкралі двое беспрацоўных з гэтай жа вёскі — 25 і 23 гадоў.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Похищенные бланки строгой отчетности — страховые полисы серии ЕО №№ 000021-001000 в количестве 980 шт. просим считать недействительными.
УНП 100367422

ФЭН-ШУЙ ГАРАСКОП

АЎТОРАК, 5 ЛІПЕНЯ

Спрыяльны для зносу будынкаў, разборкі механізмаў і г. д. Нядрэнна займацца лячэннем і здаваць іспыты.

СЕРАДА, 6 ЛІПЕНЯ

Дзень цяжкі, багаты на сваркі, канфлікты, высвятленне адносін. Важна быць сумленным, паводзіць сябе асцярожна і прыстойна, не рызыкаваць, не парушаць закон, не наклікаць на сябе гнеў.

ЧАЦВЕР, 7 ЛІПЕНЯ

Неспрыяльны для ўзаемаадносін, шлюбу і любых важных канструктыўных спраў. Складана будзе знаходзіць кампрамісы. Спрыяльны для лячэння.

ПЯТНІЦА, 8 ЛІПЕНЯ

Дзень Жыццёвай Сілы. Гэта дзень, калі дасягае піка ваша фізічная энергія. У такі дзень добра займацца справамі, якія патрабуюць канцэнтрацыі і высілкаў.

СУБОТА, 9 ЛІПЕНЯ

Спрыяльны для ўсяго, што азначае новае пачынанне, пачатак працэсу. Магчыма знаёмства з уплывовай асобай. Неспрыяльны для падарожжа на поўдзень.

Раіць спецыяліст

НЕ «НАЗБІРАЦЬ БЫ» ГРЫБКОЎ НА ПЛЯЖЫ

Адпачынак на моры-возеры, на пляжы — рэч заўсёды прыемная. І неяк не хочацца думаць аб нейкіх хваробах. Але не заўсёды можна страчваць пільнасць. Вось, напрыклад, такая дакука, як грыбок, можа прычапіцца да вас на пляжы. А пазбавіцца ад яе вельмі няпроста. Аб грыбковых інфекцыях скуры ступняў (мікозы ступняў) нам расказаў загадчык амбулаторнага дэрматавенералагічнага аддзялення Мінскага скурвендыспансэра Уладзімір ЯРОМІЧ.

Самі па сабе мікозы ступняў быццам бы і не з'яўляюцца сур'ёзнай праблемай — ад гэтага не паміраюць Але, з іншага боку, такая паталогія далёка не бяскрыўдная. Своечасова не распазнаная і не лечаная, мікатычная інфекцыя скуры можа садзейнічаць распаўсюджванню хваробы на іншыя ўчасткі цела. Пацыенты з грыбковымі інфекцыямі скуры пакутуюць ад розных псіхалагічных станаў з-за касметычных і фізічных праяў інфекцыі. Як правіла, найбольшай рызыцы заражэння спрыяюць цяпло і вільгаць. Таму часта людзі атрымліваюць інфекцыю ў месцах агульнага карыстання: лазнях, душавых, басейнах, на пляжах, у спартыўных залах.

Захворванне пачынаецца часам спакваля, непрыкметна і доўжыцца дзесяцігоддзямі. Але без лячэння амаль ніколі не праходзіць, а часам, бывае, прыводзіць да такіх ускладненняў, як экзэма, алергізацыя арганізма, далучэнне другаснай гнойнай інфекцыі, рожыстае запаленне.

Аб грыбковым паражэнні пазногцевых пласцінак можна меркаваць аб змяненні іх знешняга выгляду — колеры, празрыстасці, таўшчыні. Памутненне пазногцяў, з'яўленне белаватых, жаўтаватых, шэрых ці цёмных участкаў пазногцевай пласцінкі ў выглядзе палос ці плям, іх падоўжаная ці папярэчная счэрчанасць, «з'едзенасць» свабоднага краю, станчэнне аж да адарвання (ці, наадварот, патаўшчэнне да ступені падабенства з кіпцюрамі драпежных птушак) — усе гэтыя сімптомы сведчаць аб верагодным пашкоджанні пазногцевай пласцінкі грыбковай інфекцыяй.

Калі вы заўважылі ў сябе падобныя сімптомы, — папярэджвае У. Яроміч, — не адкладвайце візіт да дэрматолага, які перад прызначэннем лячэння паставіць дыягназ з дапамогай лабараторнага даследавання.

Я хацеў бы засцерагчы людзей ад самалячэння. Нягледзячы на тое, што ў аптэках ёсць мноства процігрыбковых прэпаратаў, толькі дэрматолаг можа комплексна ацаніць стан пацыента з грыбковай інфекцыяй. І толькі спецыяліст зможа падабраць індывідуальны метад лячэння для кожнага. Усё залежыць ад таго, які грыбок выклікаў паталогію і якія часткі цела ён пашкодзіў.

Прафілактыка мікозаў ступняў

- Штодзённа мыйце ногі цёплай вадой з мылам ці пеністым антысептычным сродкам у выглядзе воднага мыла «Цітэал».
- Сачыце за тым, каб вашы ступні былі сухія, старанна выцірайце ногі пасля душа, асабліва паміж пальцамі, выкарыстоўваючы асобны індывідуальны ручнік для ног. Калі вы ўжо заразіліся грыбком, выкарыстоўвайце кожны ручнік толькі адзін раз пасля мыцця.
- Сачыце за чысцінёй дывановых пакрыццяў, падлогі, ваннай, прадметаў індывідуальнага выкарыстання (манікюрных і педыкюрных інструментаў, губак, мачалак), рэгулярна апрацоўвайце іх мыйнымі сродкамі («Гігіена», «Пемалюкс», «Белізна» і інш.)
- Пацыентам, якія перахварэлі на мікоз ступняў, у гарачы час года паказана вонкавае супрацьрэцыдыўнае лячэнне процігрыбковымі крэмамі, мазямі. Звычайна 2-3 курсы па два тыдні з перапынкам паміж імі на 7 дзён.
- Калі ў сям'і ёсць людзі хворыя на мікоз, то лячыцца лепш адначасова, каб не заражаць адно аднаго паўторна.
- У лазнях, басейнах і спартыўных залах нідзе не павінна ступаць ваша неабутая нага.
- Пасля пляжа трэба прыняць душ з мачалкай і мылам.

Вольга ШАЎКО.

НА ЧУЖЫМ АЎТО Ў ІНШЫ ГОРАД

У Віцебску ўладальнік аўто а восьмай гадзіне раніцы паведаміў у міліцыю пра тое, што літаральна некалькі хвілін таму знікла яго «Аўдзі», якая стаяла ля дома па вуліцы Смаленская. Дарэчы, дзверы свайго любага аўтамабіля гаспадар зачыніць забыў. Кошт скрадзенага аўто ацаніў у 39 мільёнаў рублёў. І хто сказаў, што грошы на дарозе не валяюцца?

У Віцебску і яшчэ ў сямі раёнах міліцыя аператыўна ўвяла ў дзеянне спецыяльны план «Перахват». У выніку каля трынаццаці гадзін у Оршы на вуліцы Молакава супрацоўнікамі патрульна-паставой службы міліцыі і ДАІ была затрымана скрадзеная машына, за рулём якой знаходзіўся 31-гадовы работнік прыватнай фірмы, раней судзімы за крадзеж. Заведзена крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



Да рэбусаў: Таджыкістан. Анекс. Эпада. Гам. «Рэнка». Атам. Тэран. Рэпа. Наска. Ерась. Іс. Шаш. Пнеў. Кэрн. Бэрн. Бус. Шлат. Ком. Мэрі. Гітара. Ара. Акын. Гара. Кантата. Еза. Паз. Аўк. Дзянец. Гуляр. Чака. Скат. «Арпі». Арал. Тум. Масенька. Лбе. Зорка. Ява. Драма. Гарнун. Пюра. Гнеш. Гта. Сагат. Пятэка. Кораж. Гаўрык. Міск. Амаці. Лідар. Расіі. Арава. Гаўрус. Мінск. Амаці. Лідар. Расіі. Арава. Кіргізія. Беларусь. **Па вертыкалі:** Кіргізія. Бетак. Казахстан. Гаўрус. Мінск. Амаці. Лідар. Расіі. Арава. Гаўрус. Мінск. Амаці. Лідар. Расіі. Арава. Стагэ. Ара. Акын. Ком. Мэрі. Гітара. Ара. Акын. Гара. Кантата. Еза. Паз. Аўк. Дзянец. Гуляр. Чака. Скат. «Арпі». Арал. Тум. Масенька. Лбе. Зорка. Ява. Драма. Гарнун. Пюра. Гнеш. Гта. Сагат. Пятэка. Кораж. Гаўрык. Міск. Амаці. Лідар. Расіі. Арава. Кіргізія. Беларусь. **Да рэбусаў:** Таджыкістан. Анекс. Эпада. Гам. «Рэнка». Атам. Тэран. Рэпа. Наска. Ерась. Іс. Шаш. Пнеў. Кэрн. Бэрн. Бус. Шлат. Ком. Мэрі. Гітара. Ара. Акын. Гара. Кантата. Еза. Паз. Аўк. Дзянец. Гуляр. Чака. Скат. «Арпі». Арал. Тум. Масенька. Лбе. Зорка. Ява. Драма. Гарнун.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.45	21.43	16.58
Віцебск —	4.26	21.40	17.14
Магілёў —	4.35	21.33	16.58
Гомель —	4.41	21.20	16.39
Гродна —	4.56	21.56	16.00
Брэст —	5.12	21.48	16.36

Месяц

Першая квадра 8 ліпеня. Месяц у сузор'і Дзевы.

Імяніны

Пр. *Ульяны, Генадзя, Яўсея.*

К. *Зоі, Караліны, Марыі, Антона, Апанаса, Міхала, Якуба.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра

...у суседзяў

ВАРШАВА	КІЕЎ	РЫГА	
+19..+21°С	+21..+23°С	+24..+26°С	
ВІЛЬНЮС	МАСКВА	С.-ПЕЦЯРБУРГ	
+23..+25°С	+26..+28°С	+25..+27°С	

5 ліпеня

Дзве даты

1825 год — беларускі вынаходнік Казімір Чарноўскі першым у свеце пачаў распрацоўку праекта падводнага караб-

ля. Яго ідэю на практыцы ажыццявіў генерал К.К. Шыльдэр, які пабудаваў у 1834 годзе першую металічную падводную лодку.

1841 год — англічанін Томас Кук арганізаваў на камерцыйнай аснове першую турыстычную паездку паміж двума брытанскімі гарадамі, стаўшы па-сутнасці заснавальнікам турызму ў сучасным выглядзе.

Цытата дня:

«Ёсць кнігі, якія варта толькі пачытаць, ёсць такія, якія лепш за ўсё праглынуць, і толькі нямногія з іх варта разжаваць і пераварыць».

Фрэнсіс Бэкан (1561—1626), англійскі філосаф.

ПЕШШУ. Пад даждж о м. ДА МАЦІ БОЖАЙ

Запавет

Каля 2,5 тысячы пешых пілігрымаў сабраў у Будславе

Нацыянальны санктуарый Маці Божай

ВЫПРАЎЛЯЮЧЫСЯ ў пілігрымку, гэтыя людзі пакінулі працу, дом і тое размеранае жыццё, якім жылі ўвесь год. Хто на тры дні, хто на пяць, а хто і зусім на ўсе дзесяць, як польскія веласіпедысты з Варшавы.

Ранкам 1 ліпеня, калі кожная з пілігрымак даходзіла і даязджала апошнія кіламетры, у самім Будславе ішлі апошнія прыгатаванні да ўрачыстасці. Бы мурашы, шчыравалі над афармленнем галоўнага алтара сёстры, у карычневых хабітах дапамагалі насіць лесвіцы законныя браты, правяралі тэхніку супрацоўнікі відэастудыі Гродзенскай епархіі: упершыню чакалася онлайн трансляцыя з каментарыем...

Будслаў жыў чаканнем. Такі яшчэ нешматлюдны пляц перад касцёлам зранку — і ўжо тысячная працэсія пілігрымаў апоўначы...

«КАСЦЁЛ У БУДСЛАВЕ ЗА САВЕЦКІМ ЧАСАМ НІКОЛІ НЕ ЗАКРЫВАЎСЯ»

Мясцовая жыхарка Ніна Лубнеўская, вокны якой выходзяць акурат на касцёл, у Будславе пражыла трыццаць сем гадоў. Апошнія дваццаць — штогод на 2 ліпеня — перад сваім домам жанчына назірае за ўрачыстасцямі ў Будславе.

— Касцёл у Будславе за савецкім часам ніколі не закрываўся, — сведчыць жанчына. — І калі нават не маліліся, людзі ўсё роўна сюды ішлі пакланіцца Маці Божай — мясцовы абраз лічыцца цудадзейным. Памаліцца перад ім — для людзей фізічнае і духоўнае аблягчэнне. І я, хоць і праваслаўная, а ў касцёл таксама хаджу — Бог адзін.

Да пілігрымаў, якія прыязджаюць сюды круглы год, кабета ўжо прывыкла:

— Мы прымаем гэта так, як павінна быць. Калі камусьці гарбаты трэба раніцай папіць, ці памыцца — мы даём магчымасць гэта зрабіць. Гэта нармальная патрэбнасць.

Назіраючы за фэстам і набажэнствамі, за начной працэсіяй са свечкамі, жанчына шчыра прызнаецца:

— Гляджу і думаю пра вечнае. Гэта вялікі сакрамэнт. А калі працэсія ўначы, кажуць яшчэ, маўляў, калі свечка не згасла, то ўсё тваё задуманае здзейсніцца...

«ПІЛІГРЫМКА — НЕ ПАХОД»

— Некаторыя мяркуюць, што пілігрымка — гэта паход, дзе толькі адны забавы, весялосць і дзе можна ў палатках жыць, — дзеліцца юнак **Вадзім (пілігрымка «Ракаў-Мінск»).** — Насамрэч, галоўнае ў пілігрымцы — гэта малітва, духоўнае жыццё. А гэта духоўныя практыкаванні, канферэнцыі, споведзь, камунія. Гэта ёсць для нас паглыбленне веры. Шлях да санктуарыя — заўсёды цудоўныя сцежкі. Трэці раз хаджу, вельмі падабаецца...

Адметнасцю ў сёлетняй арганізацыі фэста стала прамая відэатрансляцыя, якая ўпершыню суправаджалася каментарыямі. Такім чынам усе ахвотныя, у каго не атрымалася быць у Будславе, маглі далучыцца да падзей праз відэатрансляцыю. Трансляцыю наладзілі дзякуючы падтрымцы партала TUT.BY і РУП «Белтэлекам».

— У Польшчы я была толькі ў аднадзённых пілігрымках, — распавядае **пілігрымка з Ольшчыну Барбара Стаек.** — А тут ішла цэлых пяць дзён. Вельмі цудоўная атмасфера. А якія чулыя людзі, якія прымалі нас на ноч! Яны аддавалі нам усё: свае ложкі, сваю вячэру. Я засталася пад вялікім уражаннем! Асабліва запаў у душу момант, калі разам з намі побач з вазком, у якім спала немаўлятка, ішла 76-гадовая жанчына...

БУДСЛАЎ — РАДАСЦЬ

— Вырашаючы складаныя сацыяльна-палітычныя праблемы нашага грамадства, неабходна памятаць аб тым, што пачаткам пачаткаў з'яўляецца стан духоўнага жыцця чалавека, — падкрэсліў у сваім звароце да вернікаў **мітрапаліт Мінска-Магілёўскі Тадэвуш Кандрусевіч.** — Прыкладам жа людзей, поўных Божага Духа, якія здольныя аднавіць грамадства, з'яўляецца Марыя...

— Марыя — тая, хто аб'ядноўвае людзей, — гаворыць **Марына Захарэвіч,** якая спецыяльна прыехала ў Будслаў на свята. — Гэта нават цяжка зразумець, гэта трэба адчуць. Мая дарога ў пілігрымку — гэта мінімальная ахвяра, якую я змагла прынесці Богу разам са сваёй інтэнцыяй аб здароўі для сваёй мамы. Прашу ў Бога дапамогі, прашу заступніцтва Марыі, дапамогі пазбавіцца маёй маці ўсяго лішняга ў яе жыцці. Я ніколі не хадзіла ў пешую пілігрымку, але магу ўявіць, як гэта ўнутры. Кожны год бачу гэтыя шчаслівыя твары пілігрымаў, якія ішлі да Маці Божай пехатой. Пілігрымка — ахвяра Богу, якая аб'ядноўвае людзей.

Сям'я Усніч прыехала ў Будслаў з маленькім сынам Даменікам. Маладыя муж і жонка прызналіся, што раней прыходзілі ў Будслаў пешшу, але сёлета яны — маладая сям'я — прыехалі асобна, каб падзякаваць Марыі за сына.

— Прыехалі паказаць наша дзіця Маці Божай, падзякаваць за яго, бо менавіта ў гэтым годзе яно ў нас нарадзілася. Будслаў — радасць. Нават цяпер бачу, як радуюцца людзі, якія ідуць сюды кожны са сваёй патрэбай. Мы прыйшлі падзякаваць за свайго сына. Шмат чаго мы за гэты год атрымалі ад Маці Божай і вельмі ёй удзячныя.

Пакуль мы размаўлялі, немаўлятка Даменік ляжаў на пялюшцы, час ад часу агугукаючы і цягнучыся ручкамі да ножак. Адзін момант — і ён ужо пераварочваецца на жывот і з годнасцю трымае галаву, радасна ўсміхаючыся шчаслівым бацькам.

У Будславе Бог дае сілы. Жыць.

Ілья ЛАПАТО.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.
Будслаў—Мінск.

СТРЫЖЫСЯ НА МАЛАДЗІКУ

У славянскіх народаў у адносінах да валасоў сфарміраваўся шэраг рэгламентацый:

- Каб валасы хутка адраслі, нашы прадзеды раілі стрыгчы валасы на маладзік: месяц расце, прыбывае — так і валасы будуць «расці-прыбываць». Калі ж валасы стрыгчы «на збыта» (калі месяц знікае), яны перастануць расці зусім.
- Забаранялася стрыгчы валасы дзіцяці да першага года яго жыцця, каб не «адразаць мову», г.зн. не спыніць яго разумовае развіццё.
- Першы рытуальны пострыг — «застрыжэнне», або «застрыжкі», — здзяйснялі роўна ў год. Гэтым абрадавым дзеяннем імкнуліся падкрэсліць завяршэнне першага пераходнага перыяду ў жыцці чалавека. Дзіця ўжо станавілася на свае ногі, рабіла першыя крокі, паступова пачынала прамаўляць асобныя склады ці нават словы. З гэтага моманту дзіцячыя рэчы дазвалялася перадаваць іншаму нованароджанаму дзіцяці.
- Другі пераходны этап адбудзецца пазней, у пяць, а часам і ў сем гадоў, калі дзіцяці давалі развязаць сваю пупавіну, каб «адкрыць» яго таленты, і пачыналі апранаць у адпаведнасці з полам: у штаны або спадніцу.
- Забаранялася стрыгчы валасы пастухам з Юр'ева дня і да Кузьмы і Дзям'яна, каб не ўскладняць ацёл скаціны і захаваць жывёлу ад нападу ваўкоў. Асабліва строгай была гэта забарона ў тым выпадку, калі першы выган скаціны на Юр'я супадаў са збытам Месяца.
- Добраахвотнае ахвярапрынашэнне валасоў пры пострыгу манахаў сімвалізавала адмову ад мірскога жыцця. Фактычна гэты рытуал прыраўноўваўся да сімвалічнай смерці: чалавек пакідаў штодзённы свет і пераносіўся ў свет духоўнага служэння Богу.
- Сярод славян паўсюдна існавала забарона расчэсваць валасы па вялікіх царкоўных і народных святах, а таксама па пятніцах.
- У той жа час на Віцебшчыне на Вялікдзень старыя людзі спецыяльна расчэсвалі валасы, «каб было гэтулькі ўнукаў, колькі валасоў на галаве». Калі ўзгадаць, што свята Вялікадня нагадвае пачатак Новага года, то расчэсванне валасоў насіла сімвалічны характар.
- Па структуры валасоў меркавалі пра характар чалавека. Лічылася, што той, у каго «цвёрдыя» валасы, валодае злосным норавам і ніколі не пойдзе на кампраміс, а той, у каго валасы мяккія, валодае «мяккім» характарам, падатлівы і ўраўнаважаны.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Сардэчна віншую з 70-годдзем **Сафію Міхайлаўну ВАШКЕВІЧ** з в. Галынь! Жадаю шчасця, здароўя без лекаў, дабра і спакою, доўгага веку.

Вера.

Усміхнемся

Каб аддаць дзіця ў садок, трэба даць хабар. Ваенкамат працуе па адваротным прынцыпе.

☺

Настаўніца на бацькоўскім сходзе:

— На ўроку хіміі з-за эксперыментаў Вовачкі пацярпеў увесь клас!

— Я вас зразумеў!

— Прабачце, вы — тата Вовачкі?

— Не, бацькі Вовачкі эвакуяваныя з горада, я — іх сямейны сапёр...

Считать недействительными страховые полисы СООО «Белкоопстрах»: по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств, выезжающих за пределы Республики Беларусь «Зеленая карта» серии BY/12/ №№ 4709171—4709180; по добровольному страхованию от несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БМ № 0284101, № 200669; по добровольному страхованию транспортных средств формы 2РН, 2РП серии БТ № 002752; по добровольному страхованию юридических лиц формы 2РП серии БК №№ 0002968—0002971; квитанции 1-СУ серии ГС №№ 9323651,9323645, 9323678, 9323680; по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств серии АЖ №№ 2536838, 3037502, 6653101, 6653102. УНП 102332274

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар НАРКЕВІЧ Уладзімір Браніслававіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, В. ПАЗНЯКОЎ.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная — 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 3172. Нумар падпісаны ў 19.30 4 ліпеня 2011 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12